ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 50 (1021) 10 снежня 2011 г. Кошт 1700 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

КВЕТКІ РАДЗІМЫ ПАЭТУ — АД КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

9 снежня, у дзень 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, адбылася ўрачыстая цырымонія ля помніка класіку. І першымі былі ўскладзены кветкі ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 3, 8

9 снежня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у працы 41-га з'езда Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

С. 2

СТАЦЬ КРЫНІЦАЙ ІДЭЙ ДЛЯ КРАІНЫ

ХТО Ж АТРЫМАЕ ЗАПАВЕТНУЮ ЗОРКУ?

13 снежня ў Палацы Рэспублікі адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў першай Нацыянальнай музычнай прэміі.

С. 2

Беларускае кіно: этап для новых падыходаў

З 1 студзеня 2012 года ў Беларусі ўводзяцца новыя падыходы ў дзяржаўнай падтрымцы кінематаграфіі. Адпаведны Указ № 567 “Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы і стымуляванні развіцця кінематаграфіі” быў падпісаны Кіраўніком дзяржавы 5 снежня. Пра гэта паведамляе прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дакумент падрыхтаваны ў ходзе рэалізацыі Канцэпцыі развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009 — 2014 гг. Ён устанаўлівае прынцыпова новыя падыходы дзяржаўнай падтрымкі кінематаграфіі і дадатковыя стымулюючыя меры яе развіцця, якія дадуць магчымасць сфарміраваць у Беларусі сучасную кінаіндустрыю.

У мэтах стымулявання прытоку інвестыцый у кінавытворчасць з улікам замежнага вопыту прадугледжаны пераход ад поўнага да частковага (да 70 працэнтаў ад кошту кінастужкі) бюджэтнага фінансавання здымак фільмаў па сацыяльна-творчым заказе. Астатнюю суму будзе ўкладаць прадзюсар за кошт уласных сродкаў, крэдытаў або спонсарскай дапамогі.

Бюджэтныя сродкі будуць выдзяляцца толькі на конкурснай аснове. Удзел у конкурсе змогуць прыняць усе фільмавытворчыя арганізацыі, незалежна ад формы ўласнасці. Абавязковай умовай атрымання дзяржаўнай падтрымкі стане выкананне ўсіх работ на тэрыторыі Беларусі, а таксама ўключэнне ў склад здымачнай групы не менш як 70 працэнтаў грамадзян рэспублікі.

Уладальнікам маёмасных правоў на фільм у долі бюджэтных сродкаў, укладзеных у яго вытворчасць, будзе Міністэрства культуры. Яму прадастаўлена магчымасць перадаваць, у тым ліку — на бязвыплатнай аснове, гэтыя маёмасныя правы вытворцу фільма. Атрыманы ім прыбытак будзе расходавацца на вытворчасць фільмаў, іх папулярызацыю сярод гледачоў, стварэнне матэрыяльнай базы кінавытворчасці.

Ва Указе прадугледжаны дадатковыя эканамічныя стымулы для прыватных укладанняў у кінематаграфію.

На вытворчасць фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў будуць прадастаўляцца крэдыты на выгадных умовах.

Вытворцам буйнабюджэтных фільмаў, якія паглядзела больш як 80 тыс. кінагледачоў краіны, будзе кампенсавацца 50 працэнтаў іх прадзюсарскіх рызык.

На вытворчасць фільмаў будуць таксама накіроўвацца сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі кантрольных знакаў, якія прызначаны для маркіроўкі аўдыявідэаносьбітаў з запісамі фанаграм, аўдыявізуальных твораў, тэлевізараў.

Прыняцце Указа дасць магчымасць павысіць мастацкі ўзровень беларускага кіно за кошт стварэння ў гэтай сферы эканамічнай і творчай канкурэнцыі. Дакумент таксама дасць магчымасць прыцягнуць прыватныя інвестыцыі, стымуляваць ажыццяўленне сумеснай кінавытворчасці з замежнымі партнёрамі, развіваць Нацыянальную кінастудыю “Беларусьфільм” як універсальную фільмавытворчую арганізацыю, якая адначасова з вытворчасцю ўласнай прадукцыі будзе выконваць функцыі кінафабрыкі для беларускіх і замежных майстроў кіно.

Рэалізацыя гэтага нарматыўнага прававога акта адкрые новы этап у развіцці нацыянальнага кінематографа, будзе садзейнічаць адраджэнню і прымнажэнню яго традыцый, рэалізацыі творчага патэнцыялу беларускіх майстроў кіно.

Рэдакцыя “К” у адным з бліжэйшых нумароў прапануе ўвазе чытачоў гутарку ў фармаце “круглага стала”, якая закране тыя новыя магчымасці, што адкрывае перад айчынным экранным мастацтвам Указ Прэзідэнта краіны “Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы і стымуляванні развіцця кінематаграфіі”.

Праекты і канцэпты дзеля Айчыны

8—9 снежня ў Мінску прайшоў З’езд Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Мерапрыемства сабрала прыкладна тысячу дэлегатаў з усіх куткоў краіны.

У працы з’езда прыняў удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Як перадае БелТА, у сваім выступленні Кіраўнік нашай дзяржавы, у прыватнасці, зазначыў, што Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі павінен стаць крыніцай ідэй не толькі ўласна для маладых людзей, але і для ўсёй краіны.

Прэзідэнт адзначыў, што яму прыйшоўся даспадобы маладзёжны праект “100 ідэй для Беларусі”. “Але гэта толькі першы крок, галоўнае — увасобіць усё гэта ў жыццё”, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Кіраўнік дзяржавы даручыў Ураду і Адміністрацыі Прэзідэнта рэалізаваць усе найлепшыя ідэі згаданай акцыі.

Сярод іншага, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, звяртаючыся да Урада: “Запішыце як першачарговую задачу: дайце моладзі нармальныя працоўныя месцы з добрым заробкам. Гэта не папулізм. Гэта выгадна дзяржаве, асабліва цяпер “.

Таксама Прэзідэнт адзначыў, звяртаючыся да ўдзельнікаў з’езда, што маладыя людзі павінны прыняць актыўны ўдзел у будучых парламенцкіх выбарах: “Жыццё не стаіць на месцы, лічу, што партыйнае і палітычнае жыццё ў Беларусі таксама будзе ажыўляцца, і тут вы таксама не павінны застацца ўбаку “.

У першы дзень з’езду адбылася прэзентацыя аднаго з яркіх праектаў валанцёрскага руху пад назвай “Добрае сэрца”, а вечарам у сталічным Палацы спорту прайшоў Х Дабрачынны non-Stop-марафон “Усе фарбы жыцця для цябе!” з удзелам зорак беларускай эстрады. Акцыя арганізавана ў падтрымку дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай Беларускага дзіцячага хоспіса.

— Гэта важны накірунак дзейнасці, які дазваляе моладзі дапамагчы тым людзям, якім патрэбна падтрымка, — зазначыў першы сакратар ЦК БРСМ Ігар Бузоўскі. — Юнакі і дзяўчаты сумленна аказваюць дапамогу людзям з абмежаванымі магчымасцямі, пенсіянерам, ветэранам... Падобныя адносіны да чужой бяды — найлепшая характарыстыка новага пакалення.

А на наступны дзень, 9 снежня, у фае сталічнага Палаца спорту быў прадстаўлены шэраг аўтарскіх праектаў Рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу “100 ідэй для Беларусі”. Пад час яго правядзення, з 20 верасня па 1 снежня бягучага года, у адрас арганізатараў паступіла звыш 1300 заявак. 100 лепшых праектаў у розных сферах сацыяльнага і эканамічнага жыцця краіны вызначыў экспертны савет, у склад якога ўвайшлі, у прыватнасці, прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях...

Як паведамілі “К” арганізатары, у Рэспубліканскім конкурсе ўзялі ўдзел з дзясятак аўтарскіх праектаў культурнай тэматыкі. Цікавай для арганізатараў падалася, напрыклад, ідэя віртуальнай экскурсіі па “замкавым “залатым кольцы Беларусі”. Адзін з аўтараў названага праекта, навуковы супрацоўнік Аб’яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Дзмітрый Прадун распавёў “К”, што, па яго перакананні, стварэнне праграмы візуалізацыі 3D-мадэляў беларускіх замкаў дазволіць павялічыць турыстычную прывабнасць краіны. Да таго ж, гэтае праграмнае забеспячэнне можа быць выкарыстана ў адукацыйных мэтах, а таксама створыць эфект “прысутнасці” і прарэкламуе гістарычныя адметнасці Беларусі. Падобны праект прадставіў на конкурс і настаўнік інфарматыкі з вёскі Грабоўка Гомельскага раёна Кірыл Дземусёў. Ягонае “Віртуальнае падарожжа па Беларусі” — гэта інфармацыйны веб-сайт, з дапамогай якога кожны ахвотны зможа, не выходзячы з дома, вандраваць па малых населеных пунктах нашай краіны, убачыць розныя архітэктурныя, гістарычныя і прыродныя адметнасці таго або іншага паселішча рэспублікі.

А некаторым праектам культурнай тэматыкі, па словах арганізатараў, ужо дадзена “зялёнае святло”. Так, рэалізацыю ідэі навучэнца 3-га курса Аршанскага механіка-эканамічнага каледжа Максіма Рабея “Пошукі святыні” плануецца пачаць у ліпені 2012-га. Менавіта ў гэты час распачне сваю працу археалагічны лагер па пошуку фрагментаў Рагвалодавага каменя — знакавага помніка славянскай гісторыі і культуры.

“Страцім-лебедзь” і лабараторыі

З 14 па 18 снежня ў Бабруйску пройдзе IV Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкама, аддзел культуры Бабруйскага гарвыканкама, Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча.

Як распавялі “К” у дырэкцыі тэатра, у IV Рэспубліканскім фестывалі плануецца ўдзел шаснаццаці творчых калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны і Латвіі. Спрычыніцца да сцэнічнага мастацтва можна будзе цягам пяці фестывальных дзён. Спектаклі пройдуць у Бабруйскім палацы мастацтваў, Цэнтры культуры і вольнага часу Ленінскага раёна, таксама ў самім абласным тэатры.

Менавіта на сцэне апошняга адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Рэспубліканскага фестывалю: 14 снежня тут будзе паказана п’еса Юрыя Сохара “Страцім-лебедзь” у пастаноўцы Віталя Баркоўскага, прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

Акрамя таго, у рамках фестывалю запланавана экскурсія-паездка ў вёску Панюшкавічы, дзе нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Упершыню адбудуцца адкрытыя чытанні п’ес, падрыхтаваныя акцёрамі і рэжысёрамі. Па словах начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Сінкаўца, у рабоце названых творчых лабараторый возьмуць удзел і беларускія драматургі.

Інтрыга Нацыянальнай музычнай прэміі ў галіне эстраднага мастацтва няўмольна набліжаецца да сваёй развязкі: у кожнай з намінацый засталося па 3 — 5 прэтэндэнтаў, і 13 снежня ў Палацы Рэспублікі будуць абвешчаны імёны пераможцаў. Але залогам далейшага даўгалецця самой ідэі папулярызацыі айчыннай эстрады стане канцэрт напярэдадні: 12-га ў тым жа Палацы Рэспублікі будзе прэзентавана “Залатая калекцыя беларускіх песень XX — XXI стст.”

Да прэміі — па клавішах

Абедзве імпрэзы будуць відовішчнымі і запамінальнымі. Але якія сюрпрызы чакаюць гледачоў і тэлегледачоў? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да рэжысёраў, якія рыхтуюць урачыстасці.

— “Залатая калекцыя”, — гаворыць Аляксандр Вавілаў, — гэта свята беларускіх песень, дзень роднай музыкі і беларускага слова. І наш канцэрт — гэта, уласна кажучы, наш падарунак Песні. Мне вельмі хацелася б, каб пры тэлетрансляцыі кожная кампазіцыя суправаджалася радком з імёнамі кампазітара і паэта, а не адно выканаўцы. Аўтары песень будуць прысутнічаць у зале, але ў нас не будзе часу, каб падысці ў час канцэрта да кожнага з іх: праграма і так будзе доўжыцца больш за тры гадзіны. А вось данесці іх імёны да публікі трэба абавязкова. Інакш у чым жа сутнасць самога “калекцыянавання”? Пралог будзе вырашаны ў жанры сінхрабуфанады: нам нагадаюць некалькі песень мінулых гадоў і іх выканаўцаў. А весці праграму будуць Ірына Смольская, Вольга Бурлакова — вядучыя СТБ — ды народныя артысты Беларусі Анатоль Ярмоленка і Аляксандр Ціхановіч.

— Самым цікавым на гала-канцэрце Нацыянальнай музычнай прэміі, — упэўнены рэжысёр Вячаслаў Панін, — будуць імёны пераможцаў па 16 намінацыях! Гэта шматстайнасць і легла ў аснову цырымоніі. На падобных уручэннях усе чакаюць “чырвоную дарожку”. А ў нас замест ужо звыклай чырвані дарожка стане... папраўдзе музычнай: прыступкі лесвіцы ў фае Палаца Рэспублікі ператворацца ў чароўную клавіятуру бела-чорных клавішаў. На пачатку “ўзыходжання” гасцей будзе сустракаць джазавы квартэт, у сярэдзіне шляху — “спеўныя дрэвы” (спяваць, вядома, будуць вакалісты), а ў канцы — струнны квартэт з вельмі высокіх прыгожых дзяўчат. І ўсё гэта — не пад фанаграму, а толькі жыўцом! Запомніцца і сама працэдура ўручэння прэміі. Бо кожная з намінацый будзе адкрывацца сваёй уласнай застаўкай: не толькі музычнай, але і пластычнай. Засведчу адно: кожны нумар будзе суправаджацца своеасаблівым “атракцыёнам”, чымсьці незвычайным — і абавязкова новым, не падобным на астатнія. Бо само слова “эстрада” я разумею ў самым шырокім сэнсе гэтага слова — як самае разнажанравае і дэмакратычнае мастацтва, якое вычарпаць да канца немагчыма. Эстрада ж у сэнсе “сцэна” — сама заўсёды падкідвае ідэі, і нам застаецца іх толькі рэалізаваць.

Пераможцы атрымаюць памятныя прызы, распрацаваныя скульптарам Ганнай Старавойтавай.

— Прапанова зрабіць статуэтку, — распавядае яна, — паступіла ў маі. Усё лета і восень ішла праца. Я прыдумала колькі варыянтаў, але ўсе яны ўтрымлівалі элементы, замоўленыя арганізатарамі. Паводле заказу СТБ, павінна была быць выява зоркі — і нейкія музычныя элементы. Раілася з Андрэем Хацяноўскім. Мы з ім працуем у адной майстэрні, і гэта менавіта ён прапанаваў маю кандыдатуру, бо раней сам супрацоўнічаў з тэлевізійшчыкамі — рабіў статуэтку “Тэлевяршыні”. Але колькі можна глядзець на тыя прызы? Давайце лепей паглядзім, хто іх атрымае.

Фота Юрыя ІВАНОВА
На здымках: так стваралася статуэтка.

“Перачытаць” на старце форуму

15 снежня операй “Травіята” ў пастаноўцы Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі адкрыецца II Мінскі міжнародны Калядны оперны форум.

Адзін з удзельнікаў гэтага спектакля, дарэчы, ужо наведаў наш тэатр з папярэдняй рэпетыцыяй. Гэта быў галоўны дырыжор азначанага тэатра, знакаміты Фелікс Корабаў. Бо не толькі нашы спектаклі, у якіх будуць удзельнічаць запрошаныя зоркі сусветнага маштабу, але і цалкам “прывазны” спектакль пройдуць у суправаджэнні сімфанічнага аркестра нашага Вялікага тэатра. Такая практыка добра зарэкамендавала сябе яшчэ летась.

— Адбылася толькі першая, так званая “карэктурная” рэпетыцыя, — дзеліцца ўражаннямі другі канцэртмайстар аркестра Алена Ляўданская. — Але нават тыя, хто не бачыў нашумелага маскоўскага спектакля, адразу зразумелі: гэта абсалютна новая трактоўка — не толькі па сваёй рэжысуры, але і па музычным прачытанні. Мы “перачыталі” нотны тэкст і быццам убачылі яго новымі вачыма. Былі адкрыты ўсе купюры, унесены іншыя штрыхі, узніклі куды больш хуткія тэмпы. На наступны дзень Корабаў з’ехаў, але мы замацоўвалі змены пад кіраўніцтвам нашага дырыжора Вячаслава Волічa: ён правёў папраўдзе вялізную працу. З нецярпеннем чакаем новага прыезду Корабава, артыстаў тэатра Станіслаўскага і, вядома, зорку сусветнай оперы Хіблу Герзмава, якая паўстане Віялетай.

Увага! Паважаныя чытачы!

У хуткім часе вы зноў пабачыце на старонках газеты “Культура”чарговы

“Куфар-радцу”

з найлепшымі сцэнарыямі, п’есамі, найноўшым нотным матэрыялам.

А ўжо сёння прапануем вам выказацца на тэму таго, якім вам бачыцца канцэптуальны складнік чарговых палос “Куфра”. А мо ў вас ёсць уласныя канкрэтныя напрацоўкі? Дык падзяліцеся імі з калегамі праз нашу газету!

Чакаем лістоў з прапановамі і матэрыяламі па адрасе: 220013, г.Мінск, пр-т Незалежнасці, д.77 або на электронную скрыню: kultura@tut.by

Энцыклапедыя класіка

Энцыклапедыя “Максім Багдановіч”, што анансавалася цягам года, у тым ліку і Міністэрствам культуры краіны, выйшла ў свет напярэдадні юбілею класіка ў выдавецтве “Беларуская Энцыклапедыя” імя П.Броўкі пры непасрэдным удзеле вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкладчыкаў ВНУ, архівістаў.

Як адзначыла загадчык рэдакцыі літаратуры і мастацтва выдавецтва Таццяна Рослік, складальнікамі грунтоўнай працы з’яўляюцца Мікалай Трус і Янка Саламевіч. Па яе словах, работа над энцыклапедыяй вялася цягам 20 гадоў.

У выніку, энцыклапедыя налічвае каля 2000 артыкулаў, дзе, акрамя асвятлення зместу твораў паэта, іх тэматычнай і сюжэтнай скіраванасці, аналізу выяўленчых сродкаў, падаецца інфармацыя пра першыя публікацыі, пераклады на замежныя мовы. Змешчаны таксама артыкулы пра мастацкія і публіцыстычныя творы паэта. Асобную частку матэрыялаў энцыклапедыі склалі разнастайныя артыкулы пра творчасць М.Багдановіча і, у першую чаргу, яго цудоўную лірыку. Да таго ж некаторыя матэрыялы энцыклапедыі асвятляюць сувязь Багдановіча з замежнай літаратурай і мастацтвам. Шырока паказана і повязь класіка з выяўленчым, музычным ды тэатральным мастацтвам. У выданні ўпершыню апублікавана шмат новых і малавядомых грамадскасці матэрыялаў пра шлях творцы.

Вялікая роля ў стварэнні энцыклапедыі належыць супрацоўнікам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, які 8 снежня адзначыў сваё 20-годдзе.

Каля Максімавага мора…

Насычанымі атрымаліся ўрачыстасці з нагоды святкавання 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, што прайшлі ў Ялце. У мерапрыемствах удзельнічалі не толькі мясцовыя жыхары, але і творчая інтэлігенцыя з Беларусі, прадстаўнікі айчыннай дыяспары з усёй Украіны.

Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам “К” член беларускай дэлегацыі, непасрэдны ўдзельнік урачыстых падзей у Ялце, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, вельмі важным вынікам мерапрыемстваў стала тое, што Максім Багдановіч сваёй постаццю здолеў сабраць разам беларусаў Украіны: ад самадзейных творчых калектываў да простых аматараў роднай літаратуры, якія захоўваюць беларускую культуру і мову.

— У канцэрце на ўрачыстым вечары “Разам ляцець да зорак”, што адбыўся ў клубе Чарнаморскага флоту “Ялта”, сабралася шмат мастацкіх калектываў беларускіх суполак, у тым ліку з Севастопаля, Запарожжа, Феадосіі і іншых рэгіёнаў Украіны. Пры гэтым лепшыя з іх былі адзначаны прэміяй імя Максіма Багдановіча, якая заснавана ў Крыме.

Акрамя таго, па словах Уладзіміра Гілепа, высокую ацэнку атрымалі ўрачыстасці і з боку саміх жыхароў Крыма, якія неаднаразова выказвалі словы падзякі дэлегацыі з Беларусі за яе прыезд і надзвычай цікавую праграму. Да прыкладу, вялікую цікавасць выклікала сустрэча членаў дэлегацыі — дырэктара Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Таццяны Шэляговіч, старшыні Беларускага фонду культуры Уладзіміра Гілепа і старшыні грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры нашай краіны па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Анатоля Бутэвіча са студэнтамі Крымскага гуманітарнага ўніверсітэта і яго рэктарам Аляксандрам Глузманам.

Сярод іншых мерапрыемстваў Уладзімір Гілеп вылучыў выстаўку “Маладыя гады — маладыя жаданні”, што адкрылася ў Ялцінскай дзіцячай мастацкай школе. Юныя творцы паспрабавалі праз пэндзаль і фарбы ўвасобіць паэтычныя думкі Багдановіча. Плануецца, што работы дзяцей з берага Чорнага мора, якое ў гэтыя дні беларусам бачылася і Максімавым, у хуткім часе будуць экспанавацца ў сценах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску.

Фота Анатоля БУТЭВІЧА

На здымку: Уладзімір Гілеп і Таццяна Шэляговіч (на першым плане) ля помніка паэту ў Ялце.

Увага!

Аб абмене пасведчанняў

удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на пасведчанні пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый

У адпаведнасці з пунктам 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2009 г. № 407 “Аб некаторых пытаннях абмену дакументаў, што пацвярджаюць права грамадзян на льготы” з 1 студзеня па 31 снежня 2012 года ў рэспубліцы будзе праводзіцца абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (далей — пасведчанне ўдзельніка ліквідацыі) і пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (далей — пасведчанне пацярпелага) на пасведчанні пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый (далей — пасведчанне пацярпелага).

Да завяршэння абмену, прадугледжанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2009 г. № 407, права на льготы грамадзянам, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, прадастаўляецца ў адпаведнасці з пасведчаннямі ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Падлягаюць абмену:

1. пасведчанні ўдзельнікаў ліквідацыі, выдадзеныя і перарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку да 1 студзеня 2012 г.;

2. пасведчанні пацярпелых, выдадзеныя ва ўстаноўленым парадку да 1 студзеня 2012 г.

Абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі на пасведчанні пацярпелых ажыццяўляецца дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), што праводзілі перарэгістрацыю пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі, альбо праваперaемнікамі гэтых дзяржаўных органаў (арганізацый) пры ўмове, што гэтыя дзяржаўныя органы (арганізацыі) альбо іх праваперaемнікі маюць права на ўстанаўленне грамадзянам статусу ўдзельніка ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый.

У выпадку, калі дзяржаўны орган (арганізацыя), што перарэгістраваў (перарэгістравала) пасведчанне ўдзельнікаў ліквідацыі, альбо праваперaемнік гэтага дзяржаўнага органа (арганізацыі) не маюць права на ўстанаўленне грамадзянам статусу ўдзельніка ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, абмен пасведчаннямі ўдзельнікаў ліквідацыі на пасведчанні пацярпелых праводзіцца аблвыканкамамі, мясцовымі адміністрацыямі раёнаў г. Мінска па месцы жыхарства грамадзян.

Абмен пасведчанняў пацярпелых на пасведчанні пацярпелых ажыццяўляецца па месцы жыхарства грамадзян: гарадскімі (гарадоў раённага падпарадкавання), раённымі выканкамамі, мясцовымі адміністрацыямі раёнаў у гарадах — грамадзянам, каму ўстаноўлены статус пацярпелага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый і тым, хто мае права на атрыманне льгот у адпаведнасці з артыкуламі 21 — 24 Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый”; аблвыканкамамі, Мінскім гарвыканкамам — грамадзянам (уключаючы дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў), якім устаноўлены статус пацярпелага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый і тым, хто мае права на атрыманне льгот у адпаведнасці з артыкулам 18 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый”.

Не будзе праводзіцца абмен пасведчанняў пацярпелых, што прадастаўлялі права на льготы ў адпаведнасці з артыкуламі 22 — 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 1991 года “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС”, у якія не былі ўнесены змяненні з улікам норм дзеючага Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый”.

Грамадзянін, у пасведчанне якога не ўнесены змены ў адпаведнасці з нормамі дзеючага Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый”, мае права па 31 снежня 2011 года звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, які выдаў пасведчанне пацярпелага, для ўнясення ў яго адпаведных змен. З 1 студзеня 2012 года пасведчанні пацярпелых, у якія не ўнесены змены, будуць лічыцца несапраўднымі.

Грамадзянін, чыё пасведчанне з 1 студзеня 2012 года будзе лічыцца несапраўдным, мае права звярнуцца ў выканаўчы камітэт па месцы жыхарства за ўстанаўленнем яму статусу пацярпелага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый і выдачай новага пасведчання.

У абмене пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі ці пасведчанняў пацярпелых на пасведчанні пацярпелых можа быць адмоўлена ў выпадку, калі дакументы, прадастаўленыя грамадзянінам, не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, у тым ліку з’яўляюцца падложнымі, падробленымі ці несапраўднымі.

Рашэнне аб адмове ў абмене пасведчанняў прымаецца камісіяй па ўстанаўленні статусу грамадзянам, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, адпаведнага дзяржаўнага органа.

У выпадку нязгоды грамадзяніна з прынятым камісіяй рашэннем камісія, па заяве грамадзяніна, накіроўвае дакументы для разгляду ў міжведамасную камісію па ўстанаўленні статусу грамадзянам, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, створаную пры Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях РБ.

У бліжэйшых нумарах “К” надрукуе Прыкладны пералік рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія праводзяць абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС на пасведчанні пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС, іншых радыяцыйных аварый.

“Культура-інфа”: “гарачая лінія”

Як і анансавалася, у аўторак, 6 снежня, у Інфацэнтры “Культура-інфа” з 10-й па 12-ю гадзіну працавала традыцыйная “гарачая лінія”. Гэтым разам узнімаліся надзённыя пытанні музейнай, бібліятэчнай ды клубнай дзейнасці, а таксама — народнай творчасці. Пытанні Святлане Гаўрылавай задаваліся па тэлефонах і праз рэдакцыйную электронную пошту. Паміж тэлефанаваннямі ў гутарцы з намеснікам начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь бралі ўдзел рэдактары аддзелаў “К” Яўген Рагін, Канстанцін Антановіч, а таксама спецыяльны карэспандэнт Юрый Чарнякевіч.

СТВАРЫЦЕ Ж БРЭНД ДЛЯ РЭГІЁНА!

або ЦІ “КЛЮНЕ” ІНВЕСТАР НА ЎСТАНОВЫ-“БЛІЗНЯТЫ”?

На пытанні чытачоў і журналістаў “К” адказвае намеснік начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Святлана ГАЎРЫЛАВА

Вольга ЛЕБЕДЗЬ з Мінска:

— Добры дзень, Святлана Мікалаеўна! Колькі слоў, калі ласка, пра вынікі беларускага ўдзелу ў Санкт-Пецярбургскім міжнародным музейным форуме.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Форум быў арганізаваны Саюзам музеяў Расіі і прысвечаны 20-гадоваму юбілею СНД, а таксама дзесяцігоддзю грамадскай арганізацыі. Старшыня Саюза, дырэктар Дзяржаўнага Эрмітажу Міхаіл Піятроўскі, запрасіў беларускі бок для ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве. Усяго ж там адзначыліся прадстаўнікі 304 музеяў Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы, Польшчы. Беларусь прадстаўлялі, акрамя Міністэрства культуры краіны, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, — дзевяць дзяржаўных музеяў. Цягам двух дзён мы абмяркоўвалі прадстаўлены Піятроўскім Нацыянальны даклад “Музеі — трэцяму тысячагоддзю”. Удзельнікі форуму пазнаёміліся з работай дзевяці вядучых музеяў Пецярбурга, прынялі ўдзел у дыскусіях “Культурна-гістарычная спадчына і музеі як найважнейшы фактар развіцця адзінай музейнай прасторы СНД”, “Музейная дзейнасць у кантэксце развіцця “інфармацыйнай цывілізацыі”, “Адукацыя, выхаванне як адны з асноўных функцый сучаснага музея”. Было шмат карысных пытанняў узнята для далейшага супрацоўніцтва ў прасторы СНД. Па выніках форуму мы дамовіліся, што падрыхтуем дамову аб супрацоўніцтве паміж Саюзам музеяў Расіі і нашай Рэспубліканскай Радай дырэктараў музеяў.

Вольга ЛЕБЕДЗЬ:

— Ці дасягнулі, з пункту погляду Міністэрства культуры краіны, пастаўленых мэт пры стварэнні новай рэдакцыі Закона аб музеях і музейным фондзе?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Адзначу, што Закон быў падрыхтаваны зыходзячы з практыкі яго выкарыстання. Гэта вельмі важна, таму што менавіта пры прымяненні той ці іншай нормы Закона, прынятага ў 2005-м, мы сутыкнуліся з шэрагам складаных пытанняў. Яны патрабавалі тэрміновага вырашэння на заканадаўчым узроўні. Да прыкладу: пытанні неадкладнага ўдасканалення тэрміналогіі, міжнароднага супрацоўніцтва, парадку цэнтралізаванага ўліку музейных прадметаў, вызначэння памеру платы за ўваход у музей ды шэраг іншых.… Словам, пастаўленых мэт мы, у асноўным, дасягнулі, але час вельмі хутка ідзе наперад, і я не выключаю: з’явяцца і новыя задачы, якія неабходна будзе вырашаць на заканадаўчым узроўні.

Вольга ЛЕБЕДЗЬ:

— Дзякуй!

Яўген РАГІН:

— Вернемся да згаданага музейнага форуму. Якія з нашых музеяў былі прадстаўлены ў Пецярбургу?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Вельмі прыемна, што ўдалося прадставіць рэгіянальныя ўстановы: Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, а таксама Нацыянальныя мастацкі і гістарычны музеі, Беларускія дзяржаўныя музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, народнай архітэктуры і побыту, а таксама літаратурныя музеі. Беларуская дэлегацыя, зазначу, была самай прадстаўнічай на форуме.

Яўген РАГІН:

— Тым не менш, чаму амаль усе нашы раённыя музеі падобныя адзін да аднаго, як браты-блізняты?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Дзякуй за пытанне. Я цалкам згодная з яго пастаноўкай… Калі рыхтавалі раздзел “Музейная справа” ў праект Дзяржпраграмы “Культура Беларусі”, мы прасілі абласныя ўпраўленні звярнуць увагу на стварэнне не толькі краязнаўчых музеяў, якія, безумоўна, павінны быць таксама. Але ж неабходна знайсці і разыначку, стварыць для рэгіёна адмысловую брэндавую ўстанову. Сёння яны, хоць і ў малой пакуль колькасці, ужо ёсць.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Напрыклад?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— У Лагойску — музей імя Тышкевічаў, у Ветцы — народнай творчасці, у Брэсцкай вобласці — “Бездзежскі фартушок”, “Пружанскі палацык”, Музей Напалеона Орды, на Віцебшчыне — аршанскі Музей Караткевіча…

(Працяг на стар. 12 — 13.)

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Шавялёву Уладзіміру Мікалаевічу, начальніку ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры, у сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю брата.

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр аб'явіў конкурс. Не на замяшчэнне вакантных пасад, не ў творчую трупу, а на стварэнне новых твораў: музычнай камедыі (альбо аперэты ці камічнай оперы) і мюзікла. Умовы конкурсу з'явіліся на сайце калектыву, у іншых СМІ, у тым ліку і на старонках "К" — і тэатр запрасіў дзеячаў культуры на "круглы стол", прысвечаны гэтай падзеі. Размова на ім, пачаўшыся з абмеркавання значнасці дадзенага конкурсу, закранула куды больш шырокае кола праблем: ад рэпертуарнай палітыкі тэатра да кампазітарскіх конкурсаў увогуле, ад непрадказальнасці вынікаў любых спаборніцтваў да сацыяльных гарантый творцаў розных кірункаў. Сапраўды, ці патрэбны такі конкурс, калі вынікі яго будуць падведзены толькі праз год, а каб твор-пераможцу ўбачыў глядач, давядзецца чакаць яшчэ столькі ж? Як мінімум...

Конкурс да бясконцасці альбо... тэндар на касавасць?

Спрынт ці марафон на шляху да стварэння нацыянальнага рэпертуару для музычнага тэатра: пытанне — адкрытае, але ці будзе закрыта?

Ёсць у конкурсу пачатак, ды няма ў яго канца

Арганізатары адразу прадугледзелі і "заклалі ва ўмовы" амаль бязмежную дыстанцыю: маўляў, калі праз год тэатр не атрымае новых клавіраў ці партытур, годных увасаблення, дык конкурс будзе аўтаматычна працягнуты. Але і тады, калі тэатр займее доўгачаканы твор, конкурс працягнецца — дакладней, пачнецца нанова і будзе праводзіцца рэгулярна. Бо фарміраванне нацыянальнай афішы — справа не аднаго дня і нават не аднаго года.

Добра, канешне, што ў тэатры так клапоцяцца пра стварэнне "арыгінальных высокамастацкіх твораў для музычнага тэатра, якія павінны дэманстраваць унікальнасць, самабытнасць і багацце гісторыі і культуры беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай культуры, быць канкурэнтаздольнымі, а таксама годна прадстаўляць сучасную Беларусь і тэатр на сцэнічных пляцоўках свету". Сапраўды, як прапаноўвалі арганізатары конкурсу, варта толькі вітаць трупу з такім пачынаннем. Але можна і задумацца: ці ўсе акалічнасці былі прадугледжаны? І на "круглым стале", і задоўга да абвяшчэння конкурсу, яшчэ ў канцы мінулага сезона, кіраўніцтву тэатра агучвалася шмат слушных прапаноў. Але ўсё так і засталося на ўзроўні абмеркаванняў ды абмену думкамі. Чым жа цяперашнія конкурсныя ўмовы могуць не задавольваць?

Дык дайце, дайце мне паэта! А лепш — гатовае лібрэта

Праз год, да 1 снежня 2012-га, удзельнікі конкурсу павінны прадставіць лібрэта і нотны матэрыял спектакля (дзве дзеі прыблізна па 50 хвілін кожная). Але, як сведчыць не толькі беларуская, але і сусветная гісторыя музыкі, усе оперна-аперэтачныя праблемы пачыналіся менавіта з лібрэта. А карэкціраваць яго лепей яшчэ да напісання музыкі, бо потым давядзецца перапісваць усю партытуру, а не адно літаратурны тэкст.

Больш за тое, праблемы лібрэта часта сыходзілі не столькі з уласна драматургічных пралікаў, колькі з пэўных ідэйных, нават проста тэматычных установак. Магчымасць падобных непаразуменняў закладзена ўжо ў самі ўмовы конкурсу. Бо там пазначана, што лібрэта павінна быць на беларускай мове, але нідзе не акрэслена яго скіраванасць: гісторыя ці сучаснасць, лірыка ці патрыётыка. Між тым, як паказаў "круглы стол", тэатр разлічвае на пастаноўку, найперш, твора з яркім беларускім сюжэтам. Але нават гэта ва ўмовах не акрэслена. Дый што лічыць тым самым "беларускім сюжэтам"? Ці быў, да прыкладу, той жа Максім Багдановіч цалкам "беларускім", калі звяртаўся да жанру санетаў ці рабіў пераклады? Яму, пэўна, пашанцавала: пры жыцці "небеларускасцю" яго не папракалі, а сёння ён стаў класікам, і, адпаведна, усе магчымыя прэтэнзіі зняліся. Нашым сучаснікам цяжэй: не паспеюць яны выканаць заказ, як той становіцца "састарэлым". Дастаткова ўзгадаць канчэнні кансерваторыі. Усе студэнты-кампазітары, каб атрымаць дыплом, спачатку атрымалі адно і тое ж лібрэта. Свае аднаактоўкі яны, можна сказаць, "абмянялі" на дыплом — такім чынам, ніхто не быў пакрыўджаны. А твор пераможцы — яшчэ і ўбачыў святло рампы.

Конкурс — не кан'юнктура

Намагаючыся сфармуляваць асноўныя патрабаванні да новых твораў, галоўны дырыжор Музычнага тэатра Алег Лясун адзначыў, што галоўным крытэрыем будзе цікавая музыка і п'еса, нейкая разыначка ў

Вакол мюзікла: меркаванні

Дзе? Кім? Калі?

Уладзімір КУР'ЯН, кампазітар:

— Дайце мне лібрэта, якое мяне зацікавіць, — будзе мюзікл. Але што з ім рабіць далей? Асабіста для мяне такой знакавай працай сталася колішняя рок-опера "Масфан", якую я пісаў яшчэ да паступлення на кампазітарскае аддзяленне кансерваторыі. Я быў і аўтарам музыкі, і лібрэтыстам. Але ў кожнага твора — свой лёс. І для кампазітара ён неабыякавы. Клопат пра пастаноўку можна выявіць трыма словамі, перафразіраваўшы назву тэлешоу: "Кім? Дзе? Калі?". Ад гэтых трох складнікаў поспех музычнага спектакля залежыць не менш, чым ад лібрэта і партытуры. Таму, калі аўтар з самага пачатку ўяўляе, што і як можа атрымацца, яму прасцей. Але гэта, пэўна, — ужо не конкурсныя ўмовы. А калі і конкурсныя, дык не ў цяперашнім выглядзе.

Дык патрэбны ён ці не?

Уладзімір КАНДРУСЕВІЧ, кампазітар:

— У гэты конкурс, прызнацца, я не вельмі веру. Калі ў аўтараў атрымліваецца штосьці добрае, тэатр, дбаючы пра нацыянальны рэпертуар, павінен узяць такі твор без аніякага конкурсу. Дык для чаго тады конкурс? Каб стымуляваць аўтараў? Але захвоціць іх можна іначай. Ці, можа, проста дзеля моды? Апошнім часам, калі што, адразу аб'яўляюць конкурс — і гэтым быццам бы закрываюць усе праблемы: маўляў, конкурс ідзе, мы сваю справу зрабілі. Але для аўтара, які захоча ўдзельнічаць у такім спаборніцтве, вельмі важна бачыць вынік. Асабіста я, да прыкладу, не зразумеў, якімі будуць крытэрыі. Пакуль, як мне здаецца, звяртаюць увагу адно на тэматыку твора. А ў мюзікле, на маю думку, галоўнае — мастацкі ўзровень.

Таму для сябе я яшчэ так і не вырашыў, ці буду ў гэтым конкурсе ўдзельнічаць. З аднаго боку, ужо ёсць і напісаныя творы, і задуманыя. Але ў свой час тэатр не выказаў да іх зацікаўленасці: то грошай не было, то, можа, тэматыка не падыходзіла. З іншага боку, я звычайна працую крыху па іншым прынцыпе. Калі з'яўляецца ідэя, спачатку раблю некаторыя накіды, а потым адразу паказваю іх у тэатры. І ўжо далейшая праца ідзе адпаведна тым прапановам і пажаданням, якія мне выказваюцца. Дый увогуле, думаю, конкурсы прызначаны, найперш, для моладзі, якую пакуль яшчэ не заўважылі. Пакуль жа ў тэатры існуе дзіўнаватая сітуацыя. На добры, багаты па дэкарацыях спектакль, якім там хочуць бачыць беларускі твор, грошай няма. А між тым, выпускаецца па 5 — 6, а то і болей, спектакляў на год. Зразумела, больш танных. Дык, можа, знайсці нейкае сярэднеарыфметычнае на карысць доўгачаканай беларускай пастаноўкі? Яшчэ, я думаю, тэатр павінен збіраць на такія пастаноўкі моцную творчую каманду. Не абавязкова абыходзіцца выключна сваімі сіламі. Часам, пэўна, трэба запрасіць з боку і мастака, і харэографа, шукаць новыя рэжысёрскія рашэнні.

У мюзікле заўсёды важныя не толькі музыка і сюжэт, але і відовішча! Сінтэз акцёрскай ігры і харэаграфіі, каб немагчыма было зразумець, што ў гэтай пастаноўцы галоўнае: спевы ці пластыка. Як паказвалі ранейшыя спектаклі ў жанры мюзікла ў нашым тэатры, звычайна праблемы ўзнікаюць менавіта на ўзроўні пастаноўкі.

хаця б "Белыя росы" Эдуарда Зарыцкага, замоўленыя кампазітару былым кіраўніцтвам тэатра. І такі прыклад, які тычыцца найбольш працаёмкіх і складаных музычна-тэатральных жанраў, далёка не адзінкавы. Так здараецца яшчэ і таму, што тыя заказы і дамовы, у адрозненне ад савецкіх часоў, ніяк не фіксуюцца ў афіцыйным парадку, а таму не маюць юрыдычнай сілы: падумаеш, пабяцалі аўтарам ды расказалі журналістам пра хуткую прэм'еру — потым планы маглі і змяніцца.

А што рабіць, прабачце, аўтарам? Асабліва калі гэта беларускі сюжэт і беларускамоўны твор? Дзе яшчэ гэта можа быць увасоблена? Зноў перарабляць твор, намагаючыся хоць як прыстасаваць яго пад новыя ўмовы? Запытайце любую швачку ці будаўніка — яны ў адзін голас скажуць, што рабіць "з чыстага ліста" значна прасцей, чым перарабляць штосьці ўжо гатовае.

Таму адна з прапаноў, якія неаднойчы гучалі ў тэатры і былі зноў узняты на "круглым стале", — аб'яўляць спачатку конкурс на лібрэта. А ўжо потым шукаць кампазітара. Тым больш, што самім кампазітарам шукаць паэта "для далейшага супрацоўніцтва" ці, наадварот, паэтам шукаць кампазітара не заўсёды зручна: як гаворыцца, паэтам можаш ты не быць, а сябрам быць — ну, проста абавязаны. Іншымі словамі, чыста чалавечыя стасункі і ўласна творчыя — гэта крыху розныя рэчы. Цудоўна, калі яны супадаюць, але так бывае не заўсёды.

У гэтай сувязі ўзгадаем адну хрэстаматыйную конкурсную гісторыю — праўда, пра оперу, а не аперэту. Опера "Алека" С.Рахманінава, як вядома, была напісана пры заспектаклі, запамінальныя мелодыі. Рэжысёр Ганна Маторная была больш безапеляцыйнай: "Твор для нашага тэатра павінен быць касавым". Праўда, мастацкі кіраўнік тэатра Адам Мурзіч адразу ж унёс у гэта карэктывы: "Арыентавацца адно на касу мы таксама не будзем. Рашэнне правесці конкурс не кан'юнктурнае. Наша задача — выхоўваць, найперш, чалавека, а каса дадасца".

Дарэчы, а чаму касавасць і мастацкія каштоўнасці павінны апынацца па розныя бакі барыкад? І ўвогуле, навошта тыя барыкады? Калі ў тэатра ёсць свая публіка, якая мае ўласныя прыхільнасці, а "перавыхоўваць" яе і змяняць арыенціры — патрабуецца час, дык, можа, пайсці ёй у чымсьці насустрач? А яшчэ лепей — пачынаць нават не з лібрэта, а з самой ідэі: пра што, на якую тэму ці паводле якога сюжэта мы хочам атрымаць новы твор. Зірніце на цітры любога серыяла: там звычайна спачатку пазначаны аўтар ідэі, а ўжо потым — аўтары сцэнарыя і ўсе астатнія.

Адным з сааўтараў ідэі магла б стаць... сама публіка. Усё, што для гэтага патрабуецца, — паставіць у фае скрыначку для галасавання і разам з квіткамі на спектакль раздаваць апытальнікі: пра што вы хацелі б паглядзець новы спектакль? Каб гледачам было прасцей рабіць свой выбар, у апытальніку могуць быць пазначаны некалькі тэм. Каб атрыманыя даныя былі больш дакладнымі, такое апытанне павінна ахопліваць наведвальнікаў розных спектакляў, а не якога-небудзь аднаго.

Пры падобным "конкурсе" (а насамрэч, звычайным маркетынгу), да ўсяго, не будзе крыўд — накшталт той, што была выказана рэжысёрам Настассяй Грыненка: маў-

ляў, мы вам тут ідэю народзім, потым лібрэта складзем — а што будзеце рабіць вы? І чаму мы павінны вас "вучыць", што і як рабіць, каб гэта было цікава?

Да таго ж, як паказвае практыка, новая пастаноўка можа прыцягнуць і новую публіку — трэба толькі больш акрэслена ўяўляць сабе мэтавую аўдыторыю будучай пастаноўкі. І, адпаведна, менавіта да гэтай аўдыторыі звяртацца, распаўсюджваючы квіткі.

Дзе тут у вас тэатральная "свацця"?

Вось мы і падышлі да галоўнага, чаго, здараецца, не хапае не толькі аднаму асобна ўзятаму тэатру, але і ледзь не ўсім нашым установам культуры. Сёння, як ніколі, запатрабаваны менеджары. Тыя, хто рабіў бы ўсё гэта не сам, не на ўласным энтузіязме, а сіламі найлепшых спецыялістаў, якіх бы збіраў, "сасватваў" адно аднаму, а таксама ставіў перад імі пэўныя задачы, абсалютна дакладныя тэрміны і іншыя "зададзеныя параметры", што дыктуюцца эканамічным складнікам, — і даваў пры гэтым творчую свабоду ў самавыяўленні. Дык чаму б не выкарыстаць той вопыт?

Сёння, як ніколі, нам патрэбны крэатыўшчыкі, якія выступяць завадатарамі тых ці іншых праектаў, скіраваных і на публіку, і на яе выхаванне. Бо нельга выхоўваць на тым, што не прымаецца і не ўспрымаецца, — як і нельга проста ісці за публікай, не прапаноўваючы ёй штосьці большае за тое, на што яна арыентавалася дагэтуль.

Дык што, конкурс увогуле непатрэбны? Чаму ж. Але аб'яўленне конкурсу тэрмінам на год зусім не азначае год чакання, "склаўшы рукі": маўляў, вось напішуць кампазітары штосьці, тады і будзем прымаць рашэнні. А не напішуць — працягнем конкурс яшчэ на год. Потым, калі што, працягнем зноў — і так да бясконцасці. Няўжо нельга паскорыць працэс? Ці стымуляваць яго яшчэ нейкімі захадамі?

Прабачце за побытавае параўнанне, але любая гаспадыня, накіраўваючыся на кірмаш, спачатку акідвае позіркам (ці ўзнаўляе ў памяці) ужо зробленыя прыпасы. А ці ведаем мы, што было напісана нашымі аўтарамі хаця б апошнім часам? На тым жа "круглым стале" ўзгадваліся ўжо прапанаваныя тэатру, але пакуль не пастаўленыя мюзіклы Уладзіміра Кандрусевіча, Ганны Казловай. Адказ бывае традыцыйным: няма грошай. Сапраўды няма? А на конкурс знойдзецца? Ці ўсё ж такі тэатр чымсьці не задаволены ў прапанаваным аўтарамі матэрыяле? Тады трэба сфармуляваць свае патрабаванні і прэтэнзіі. Ці, можа, пазнаёміць грамадскасць з ужо напісанымі творамі — у канцэртным варыянце, на які, зразумела, грошай хопіць.

Апошні варыянт усё больш распаўсюджваецца ў замежжы. Такія канцэртныя прэзентацыі забіваюць адразу некалькіх зайцоў. Прэм'ера — адбываецца. Грамадскасць — знаёміцца, што называецца, на свае вушы, а не атрымлівае пастаноўку ці яе адсутнасць як "рашэнне мастацкага савета". І, як вынік, маркетынг — адбываецца сам па сабе: зразумеўшы рэакцыю публікі на канцэртнае выкананне, можна прадбачыць і сцэнічны лёс твора. Бо якой бы шыкоўнай ні была пастаноўка, калі ў тым жа мюзікле слухаць няма чаго, публіка не пойдзе другі ды трэці раз глядзець адно на дэкарацыі ды сцэнічныя строі.



Што ж уласна да конкурсу, дык, як справядліва заўважылі на "круглым стале" маладыя кампазітары, існуе і конкурсная мадэль, чымсьці падобная на кінапробы. Маючы гатовае лібрэта, арганізатары прапаноўваюць напісаць некалькі найбольш значных музычных фрагментаў — і запрашаюць пераможцу да далейшага супрацоўніцтва, замаўляючы яму ўвесь твор.

Дададзім, што такі конкурс можа быць накіраваны на пошук яшчэ не вядомых імёнаў, якія не паспелі заявіць пра сябе, але маюць багаты творчы патэнцыял. Што ж тычыцца астатніх, дык ведаючы ранейшыя творы і саму творчую манеру таго ці іншага кампазітара, можна практычна беспамылкова прадбачыць, якім будзе паводле стылю канчатковы вынік. І, зразумела, замаўляць твор таму з аўтараў, хто ўяўляецца больш адпаведным чаканням.

Так што аб'яўлены конкурс застаецца пакуль "адкрытым пытаннем". Не, ніхто не прапануе яго "ўзяць ды адмяніць". Але працягваць працу па пошуку і назапашванні нацыянальнага рэпертуару трэба не толькі конкурснымі метадамі. Дый саміх варыянтаў конкурсу, як пераконвае гісторыя і сучаснасць, можа быць безліч.

... Дык чаму ж творцы, якія павінны б радавацца аб'яўленаму конкурсу, ставяцца да яго, мякка кажучы, разважліва? Хтосьці глыбока задумваецца, а хтосьці ўвогуле не хавае свайго скепсісу. Як можна пераканацца з выказванняў, аўтары не ўпэўнены, ці дасць іх праца плён. Усё ж музычны спектакль будзе патрабаваць ад іх цэлага года, як кажуць, творчага альтруізму.

А тэатр, між іншым, хвалюе ўсё тая ж праблема. Беларуская пастаноўка будзе патрабаваць ад творчай групы сіл і часу для марных высілкаў. Бо перад вачыма — многія і многія прыклады беларускіх, найперш, опер, якія былі пастаўлены, але ў рэпертуары не затрымаліся. Нават на маёй памяці быў прыклад, калі адзін з такіх спектакляў быў вылучаны на Дзяржаўную прэмію Беларусі. Але на той час, калі камісія сабралася разглядаць пададзеныя заяўкі і больш падрабязна знаёміцца з творамі, спектакля ў рэпертуары ўжо... не было. І камісія прымала рашэнне на аснове прагляду відэакасеты. Опера ўсё ж атрымала прэмію — паводле музыкі, абсалютна заслужана. Але тут і сапраўды ёсць аб чым задумацца...

Па сутнасці, і творцы і тэатр пачуваюць сябе ў стане "без права на памылку", тупіковым для культуры. Бо "не памыліцца" можна толькі рухаючыся праверанай дарогай ці ўвогуле не робячы ні кроку. Можа, трэба проста пісаць ды ставіць? І не адзін спектакль, які адразу павінен атрымацца "шэдэўрам ва ўсіх адносінах", а адзін, другі, трэці... Можа, тады і публіка прызвычаіцца цікавіцца нацыянальнымі навінкамі, а не адно "праверанай класікай".

Надзея БУНЦЭВІЧ

Вакол мюзікла: меркаванні

Як давесці пастаноўку да публікі?

Ганна КАЗЛОВА, кампазітар:

— У конкурсе, аб'яўленым нашым Музычным тэатрам, буду ўдзельнічаць абавязкова. Я ўжо нават падала ім частку дакументаў, хаця наперадзе яшчэ цэлы год. Але ўвесь парадокс сітуацыі ў тым, што твор для гэтага конкурсу ў мяне даўно гатовы. Проста ў мяне няма іншага выйсця, як, можа, іначай прапанаваць тэатру свой мюзікл. Уласна кажучы, мюзікл не проста прапанаваны, але і "знаходзіцца не пад сталом, а на стале" ў мастацкага кіраўніка тэатра Адама Мурзіча, як той адзначыў на прэс-канферэнцыі і пасяджэнні, прысвечаных конкурсу. Ды толькі ніякага далейшага ходу, акрамя конкурсу, з боку тэатра няма. А між тым, гэта ўжо другая версія твора! Мой першы мюзікл пра апетае ў легендах і мастацкіх творах каханне Барбары Радзівіл і Жыгімонта называўся "У замку Радзівілаў, ці Гісторыя вечнага кахання". Ён, між іншым, нават быў пастаўлены — у... ПТВ хлебнай прамысловасці. Гэта было ў 2005 годзе. Да Новага года артысты опернага тэатра на чале з тагачаснай салісткай філармоніі Вольгай Сотнікавай (яна зараз жыве і працуе ў Мексіцы) падрыхтавалі гэты твор і паказалі яго на сцэне вучылішча. Поспех у моладзі быў — неверагодны! Але больш творам ніхто асабліва не зацікавіўся. Зараз у мяне напісаны новы мюзікл паводле ўсё той жа сюжэтнай лініі — "Барбара new". І хаця аўтарам лібрэта выступае ўсё тая ж Таццяна Сінкевіч, гэта зусім іншы твор. Першы быў прызначаны для дзіцяча-юнацкай аўдыторыі, у ім было больш містыкі, фэнтэзі, што запатрабавана ў гледачоў такога ўзросту. У другім — новая задума, іншы сцэнарый, новыя героі, дый сам разгорт тэмы, як можна зразумець ужо з назвы, больш сучасны. Але хто пра гэта ведае, акрамя, трэба спадзявацца, кіраўніцтва Музычнага тэатра? Як давесці ўсё гэта да публікі? Бо нават самі артысты, якія пазнаёміліся з творам, літаральна палаюць жаданнем хутчэй яго выканаць. Але надзей на тэатральнае ўвасабленне твора пакуль няма. Мне нават казалі: маўляў, шукайце спонсара, тады, можа, што і атрымаецца. У лютым у мяне павінен прайсці аўтарскі вечар. І я вырашыла, што другое аддзяленне на ім складзе канцэртны паказ мюзікла. Дарэчы, ва ўмовах конкурсу, аб'яўленага Музычным тэатрам, нідзе не занатавана, што гэта павінна быць абсалютна новая партытура, якая яшчэ нідзе не гучала. Дык хай хаця б прагучыць — для шырокай публікі!

Вакол мюзікла: меркаванні

Як без каманды?

Андрэй ЗУБРЫЧ, кампазітар:

— Я ўвогуле не аматар конкурсаў. Бо існуе і такі паказальнік, як, так бы мовіць, фармат. Калі да цябе звяртаецца кіраўніцтва творчага калектыву, калі ты працуеш "у камандзе", удзельнікі якой імкнуцца да адной мэты, калі яны разумеюць, да чаго трэба ісці і што павінна атрымацца, — гэта зусім іншая справа. Так, у мяне ёсць два мюзіклы, яны ідуць у Расіі. Але гэта была замова. Да мяне звярнуўся галоўны рэжысёр тэатра, ён жа выступіў аўтарам лібрэта — і праца пайшла. У Беларусі такіх прапаноў я пакуль не атрымліваў. Але калі яны будуць — калі ласка, пагаджуся не толькі я, тое ж самае вам адкажуць, упэўнены, астатнія. Аўтару заўсёды важна бачыць зацікаўленасць тэатра, жаданне і магчымасці ўвасобіць будучы твор на сцэне. Тады і папраўдзе ты можаш працаваць з разлікам на пэўныя пастановачныя рашэнні, тых ці іншых артыстаў. Мюзікл сёння — адзін з самых запатрабаваных жанраў. Яму падуладны любыя тэмы, бо ўсё залежыць, у рэшце рэшт, ад мастацкага складніка. Тое ж "Дзікае паляванне караля Стаха" Уладзіміра Караткевіча — па ім безліч спектакляў зроблена. У нашым Вялікім тэатры і дагэтуль ідзе аднайменная опера Уладзіміра Солтана. Гадоў шэсць таму дырыжор Вячаслаў Воліч прапанаваў мне зрабіць сумесны сімфанічна-рокавы праект. Я тады падкрэсліваў, што атрымалася не рок-опера, а гэткі незвычайны вакальна-інструментальны твор з выкарыстаннем оперных тэм. Але паводле "Дзікага палявання..." мог бы быць і мюзікл. Чаму б не? Было б жаданне...

А можа "дэма" на пачатку...

Сяргей БАДАЛАЎ, студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:

— На сённяшні дзень для маладых кампазітараў існуе шмат магчымасцей заявіць пра сябе — у тым ліку праз конкурс. Але не думаю, што тое спаборніцтва, якое зараз аб'яўлена Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатрам, збярэ надта шмат ўдзельнікаў, нават сярод студэнцкай моладзі. Таму што, зноў-такі, ёсць шмат магчымасцей выбіраць. І кампазітару больш цікава напісаць, да прыкладу, камерны твор, які ён потым зможа выканаць у канцэрце. Мюзікл жа, калі той не будзе абраны тэатрам, гэтак "уладкаваць" будзе немагчыма. У выніку гэта будзе год-два працы, пра вынікі якой так ніхто і не даведаецца. Яшчэ я звярнуў бы ўвагу на такую акалічнасць. Як мне падалося, у арганізатараў пакуль няма дакладнага "рэгламенту", што яны хацелі б атрымаць. Ёсць толькі прыблізная працягласць твора і неабходнасць беларускай мовы. А раптам здарыцца так, што твор акажацца добрым па мастацкіх якасцях, але не падыдзе па нейкім фармаце, неабходным тэатру? Вось кампазітары і думаюць... Таму прапаную правесці конкурс на стварэнне дэма-версіі асобных фрагментаў твора, па якіх тэатр зможа зарыентавацца, пераканацца ў магчымасцях аўтара і тады ўжо замаўляць твор цалкам.

"Пастка" для тэатра

Алесь БАДАК, паэт:

— Конкурс на стварэнне музычнага спектакля, на маю думку, — рэч даволі небяспечная. І для творцаў, і для самога тэатра. Асабліва на тых умовах, якія зараз аб'яўлены. Бо жанры аперэты, музычнай камедыі, мюзікла — гэта, з аднаго боку, буйная форма, якая патрабуе вялікіх высілкаў з боку ўсіх яе стваральнікаў. Па-другое, тут важны "камандны дух". Па-трэцяе, магчымасці давесці свой твор да публікі. З песняй — усё куды прасцей. А з мюзіклам? Калі гэты твор не пераможа на конкурсе, у яго няма далейшага лёсу. Ці многа вы бачылі выдадзеных партытур нашых мюзіклаў? Вось і атрымліваецца, што ў падобных конкурсах, дзе "неперамога" вядзе да тупіковай сітуацыі, удзельнічаюць, пераважна, тыя, каму страчваць практычна няма чаго. Гэта значыць, не прафесійныя, сур'ёзныя аўтары, а, прабачце, графаманы. Мне неяк давялося працаваць у журы конкурсу на стварэнне гімнічнай песні (апошнім часам і асобныя гарады, і буйныя прадпрыемствы хочуць мець уласную падобную). І калі я паглядзеў, што было даслана, дык мяне жах ахапіў: прафесійных аўтараў практычна не было — адно вершаплётства, бессэнсоўныя, больш ці менш зрыфмаваныя радкі з жудасным рытмічным "кульганнем". Я тады задумаўся, чаму ж так, чаму гэты конкурс не зацікавіў добрых паэтаў, хаця на прызавы фонд там, здаецца, не скупіліся. І зразумеў: таму што такі гімн, калі ён раптам не пераможа, ты больш не рэалізуеш нідзе. А жанр мюзікла — тут, хочаш ці не, патрабуецца прафесіянал. Дакладней, каманда прафесіяналаў.

Асаблівая каштоўнасць мінскай архітэктуры 1930 — 1950-х — не толькі ў манументальнасці, у цэласнасці гарадскога ансамбля, але таксама і ў той датклівай увазе да дэталяў, якая была ўласціва яе стваральнікам. Таму чужародныя сучасныя ўварванні ў аблічча гэтых дамоў выглядаюць недарэчнымі. Напрыклад, сучасныя балконныя дзверы, якія дысгармануюць з колерам фасада, або вялізная рэкламная шыльда, што бярэ на сябе зашмат увагі... Гэта — тыповыя ўзоры парушэння айчыннага заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Неўзабаве іх статыстыка рызыкуе істотна пагоршыцца. Зрэшты, тэму гарадской жылой забудовы мы ўздымалі літаральна ў мінулым нумары на прыкладзе Брэста. Цяпер само жыццё дало нагоду працягнуць яе.

Рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны прыняла рашэнне аб неабходнасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці адразу 92 будынкам у цэнтры Мінска, прыналежным, пераважна, да савецкага перыяду.

Гэтае бадай беспрэцэдэнтнае паводле сваёй маштабнасці папаўненне Дзяржаўнага спісу будзе ўтрымліваць і яшчэ адну акалічнасць: амаль усе аб'екты, якія прапанавана ўзяць пад апеку дзяржавы, — шматкватэрныя жылыя дамы. І калі рашэнне Рады набудзе законную сілу пасля прыняцця адпаведнай пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, тысячы "шараговых" мінчан у адначассе стануць непасрэднымі выканаўцамі заканадаўства аб ахове спадчыны. У адзін цудоўны дзень яны раптам прачнуцца не ў "звычайных" дамах, але ў помніках архітэктуры. Натуральна, змена статусу прадугледжвае і новыя абавязкі, а таксама — адказнасць за іх выкананне.

Прачнуцца... у помніку архітэктуры

"Не мы крайнія...", або Прызма сталяркі і "няправільных" вокнаў

Замяніў сталярку "пластыкам"

Каб выявіць факты "побытавых" парушэнняў заканадаўства ў сферы аховы спадчыны ў цэнтры Мінска, зусім неабавязкова праводзіць адмысловыя інспекцыі альбо рэйды. Варта толькі прыглядзецца да вокнаў будынкаў, уключаных у Дзяржаўны спіс. Большасць з іх — гэта сучасныя пластыкавыя вырабы, і ці не ў кожнай квартэры яны — на свой капыл.

Збочыўшы ў двор "сталінкі", што месціцца на праспекце Незалежнасці, "заспеў на гарачым" і канкрэтнага парушальніка. З дзвярэй аднаго з пад'ездаў акурат выносілі на сметнік старую "сталярку". Як выявілася, зусім нядаўна яна была заменена навюткім "пластыкам".

— Капітальны рамонт дома не рабіўся вось ужо чвэрць стагоддзя, і мы вырашылі не чакаць "з мора надвор'я", а самім парупіцца пра ўласны камфорт, — тлумачыць гаспадар кватэры Вячаслаў.

Граху ў гэтым, натуральна, няма, але... Як патлумачыў начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Ігар Чарняўскі, паводле айчыннага заканадаўства, для правядзення нават такіх банальных работ патрэбны дазвол Міністэрства культуры краіны. Бо "няправільныя" (неадпаведныя стылістыцы і колеравай гаме фасада) вокны здатны стаць эстэтычна чужародным элементам у абліччы помніка.

— Не, мы нікуды не звярталіся па ўзгадненні, — шчыра прызнаўся Вячаслаў. — Гэта, напэўна, вымагае і грошай, і часу... Паглядзелі, што суседзі памянялі вокны, і вырашылі зрабіць тое самае. У нашым доме мы не адны такія, значыць, не мы і "крайнія"...

Гэтая "ланцуговая рэакцыя" дазваляе зразумець алгарытм з'яўлення той праблемы, пра якую сёння гавораць не толькі спецыялісты ў сферы аховы спадчыны, але нават ужо і супрацоўнікі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Урэшце, звяртаюць увагу на яе і простыя мінакі.

Эталонная мадэль

Зрэшты, у дадзеным выпадку можа паўстаць заканамернае пытанне. Няўжо шараговы грамадзянін В. абавязкова мусіць нанесці асабісты візіт непасрэдна ў Міністэрства культуры, каб атрымаць там дазвол (хай сабе насамрэч ён і бясплатны) на замену акна ў сваёй кухні — як быццам бы гаворка вядзецца пра сур'ёзныя рэстаўрацыйныя работы? На сёння адказ на гэтае пытанне з'яўляецца станоўчым, і законапаслухмяныя грамадзяне ўспрымаюць падобныя патрабаванні ўсур'ёз. Іншая справа — ці можна лічыць такі механізм ідэальным?

— Штат нашага ўпраўлення зусім невялікі, і, па шчырасці, мы проста захлынаемся ў падобных справах, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Аляксандр Ленкаў. — А пасля ўключэння ў Дзяржаўны спіс ледзь не сотні новых аб'ектаў рызыкуем і ўвогуле патануць у іх з галавой. Дзеля "сталяркі" нярэдка даводзіцца адкладаць вырашэнне куды больш важных і складаных пытанняў, датычных той жа рэстаўрацыі.

Менавіта таму Міністэрства культуры выступіла з ініцыятывай удасканалення гэтага механізму, якая, на думку Аляксандра Ленкава, павінна спрасціць жыццё і супрацоўнікам упраўлення, і шараговым жыльцам. ЖРЭА сталіцы (якія з'яўляюцца ўласнікамі "жылых" помнікаў спадчыны) атрымалі прапановы распрацаваць тыпавыя схемы вокнаў і тых дзвярэй, што выходзяць на вуліцу. Прычым для кожнага ўнесенага ў Дзяржаўны спіс будынка яны павінны быць адмысловымі.

Падставай для такой ініцыятывы стала і рашэнне Мінгарвыканкама адносна фасадаў помнікаў архітэктуры, якім рэгулюецца ўстаноўка спадарожнікавых антэн, кандыцыянераў, замена дзвярных і аконных запаўненняў. На жаль, гэтае рашэнне, прынятае ўжо некалькі год таму, выконваецца далёка не заўсёды.

— Наступны этап — узгадненне тыпавых схем у Міністэрстве культуры, — кажа начальнік аддзела навукова-праектных работ і рэстаўрацыйнай вытворчасці згаданага ўпраўлення Вольга Міхайлава. — Мы ўжо пачалі гэтым займацца, аналізуючы тыя прапановы, што паступілі ад некаторых ЖРЭА Мінска.

Адпаведна, схема і сапраўды простая. Выпрацоўваюцца пэўныя эталонныя мадэлі таго самага вакна альбо дзвярэй на балкон, якія адпавядаюць стылістыцы фасада канкрэтнага будынка. І прыйшоўшы ў свой родны ЖЭС (які нават геаграфічна бліжэй, чым Міністэрства культуры), жыхар уключанага ў Дзяржспіс дома здолее азнаёміцца з прапанаванымі яму варыянтамі ды замовіць выраб дзвярэй альбо вокнаў абранаму ім самім вытворцу. У хуткім часе падобны ўніфікаваны механізм будзе распрацаваны таксама і адносна ўстаноўкі іншых "украпванняў сучаснай цывілізацыі": спадарожнікавых антэн і кандыцыянераў. А ўжо налета гэтыя інавацыі могуць замацавацца ў Законе аб ахове спадчыны — Міністэрства культуры выступіла з ініцыятывай аб унясенні ў яго адпаведных паправак.

— У той самы час, рамонт узроўню "паклеіць шпалеры" ніякіх узгадненняў, вядома, не патрабуе, — дадае Аляксандр Ленкаў. — У артыкуле 38 Закона гаворыцца, што "бягучыя" работы могуць адбывацца без дазволу Міністэрства культуры. Іншая рэч — скажам, перапланіроўка, альбо тая ж сталярка... Многія не бачаць тут прынцыповага адрознення. Але няведанне закону, як вядома, не вызваляе ад адказнасці.

У выпадку з жыльцамі тых дамоў, якія неўзабаве маюць атрымаць статус помніка, гэтая юрыдычная формула актуальная асабліва. Адсюль і пытанне: як праінфармаваць іх пра новыя абавязкі?

— Кожны з нас атрымлівае па пошце г.зв. "разлікоўкі", і чаму б не ўключыць патрэбную інфармацыю на адваротны бок таго аркушыка? — прапануе Аляксандр Ленкаў. — Альбо размясціць адпаведную абвестку на кожным з пад'ездаў дома. Ва ўсякім выпадку, займацца гэтым павінны менавіта ЖРЭА тых раёнаў, дзе месцяцца помнікі спадчыны.

Усталяванне ахоўнай дошкі, падрыхтоўка пашпарта і ўліковай карткі такіх помнікаў спадчыны стане прэрагатывай уласнікаў — тых самых ЖРЭА. А вось ахоўныя абавязальніцтвы павінны будуць падпісаць гаспадары кожнай з кватэр. Як адзначыў Ігар Чарняўскі, сёння гэта зазвычай адбываецца толькі ў выпадках, калі кватэра мае стаць аб'ектам здзелкі на рынку нерухомасці. А ў тым выпадку, калі ніякіх аперацый не плануецца, гаспадары і не рупяцца. Зрэшты, многія і не ведаюць пра такія свае абавязкі. І таму з боку ЖРЭА было б не лішнім пра іх перыядычна нагадваць.

Рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны прыняла рашэнне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці адразу 92 будынкам у цэнтры Мінска, прыналежным, пераважна, да савецкага перыяду...

Перашкаджае ці не?

Па еўрапейскай традыцыі, першыя паверхі старых дамоў у цэнтры Мінска ды іншых буйных гарадоў усё часцей займаюць не кватэры, а крамкі, кавярні ды розныя іншыя аб'екты сэрвісу. І кожны з іх імкнецца завабіць кліентаў сваёй шыльдай, не заўсёды дапасоўваючы яе да агульнага аблічча помніка спадчыны. Не так даўно ўвагу на гэтую праблему ўшчыльную звярнула і Генеральная пракуратура краіны, выявіўшы цэлую плойму фактаў парушэння заканадаўства ў адным асобна ўзятым квартале. Але, як запэўніла Вольга Міхайлава, парадак у гэтай сферы неўзабаве будзе наведзены.

— Літаральна на гэтым тыдні мы зладзім першы сур'ёзны маніторынг, датычны ўсталявання рэкламы ў Мінску, — распавядае спецыяліст. — Гэтая праверка, якая ахопіць канкрэтны раён горада, будзе праведзена разам з прадстаўнікамі Камітэта па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама, Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь. Усе выяўленыя намі парушальнікі заканадаўства атрымаюць адпаведныя прадпісанні.

З іншага боку, парушальнікі тут таксама могуць спаслацца на элементарнае няведанне. Закон патрабуе ад іх, каб рэкламная інфармацыя не перашкаджала ўспрыманню помніка спадчыны. Але ці можа спецыяліст у галіне рэкламы вызначыць: перашкаджае альбо не? Тым болей, нейкія шаблоны "на ўсе выпадкі жыцця" выпрацаваць тут немагчыма.

— Да кожнага аб'екта патрэбны індывідуальны падыход, — кажа Вольга Міхайлава. — Прыкладам, на даху вялікага будынка можна размясціць рэкламную канструкцыю, а вось выгляд, скажам, двухпавярховай камянічкі яна істотна пагоршыць.

Самыя тыповыя парушэнні — гэта, уласна, памер рэкламнай прадукцыі, размяшчэнне інфармацыі на яркай вялікай падкладцы, усталяванне мажных бакавых кранштэйнаў. Да таго ж, рэклама ні ў якім выпадку не павінна перакрываць дэкаратыўныя элементы будынка. У сваю чаргу, прымальныя варыянты — гэта асобныя літары непасрэдна па-над уваходам ва ўстанову альбо размяшчэнне інфармацыі ў вокнах ці фрамугах.

— У мяне ёсць два альбомы са станоўчымі прыкладамі размяшчэння рэкламы на помніках спадчыны ў еўрапейскіх гарадах, і гэтыя ўзоры я дэманструю тым, хто звяртаецца да мяне па кансультацыю, — кажа Вольга Міхайлава. — Нават тыя міжнародныя кампаніі, якія зазвычай выкарыстоўваюць маштабную і яркую рэкламу, у дадзеным выпадку абмяжоўваюцца сціплымі і густоўнымі варыянтамі.

Самі падыходы будуць замацаваны ў адмысловай Інструкцыі, якая цяпер распрацоўваецца супрацоўнікамі ўпраўлення разам са спецыялістамі з іншых датычных да размяшчэння рэкламы арганізацый.

— Яна змесціць канкрэтныя патрабаванні, у прыватнасці, дапушчальныя памеры тых жа кранштэйнаў, — дадае Вольга Міхайлава. — І тады рэкламшчыкі ад пачатку будуць ведаць, якімі правіламі кіравацца пра распрацоўцы эскіза.

Заканадаўчы вузел? Хутчэй, практычнае вырашэнне!

Між тым, адказу вымагае і пытанне, што ж рабіць з тымі фактамі парушэння заканадаўства, якія ўжо адбыліся. Усяго сціплага штату адпаведнага ўпраўлення Міністэрства культуры наўрад ці хопіць нават для таго, каб проста падлічыць, колькі вокнаў і балконных дзвярэй было ўсталявана ў нашай краіне з парушэннем заканадаўства. Бо зразумела, што лік ідзе на дзясяткі тысяч.

— Мы рыхтуем праект рашэння Мінгарвыканкама, паводле якога ЖРЭА павінны правесці абследаванні помнікаў спадчыны, што ім прыналежаць, выявіць падобныя факты і... пачаць работу з жыхарамі, — кажа галоўны спецыяліст упраўлення культуры Мінгарвыканкама па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Наталля Радчанка. — Так, менавіта пачаць! Бо чакаць, што праблема вырашыцца ў адначассе, наўрад ці выпадае.

Пры гэтым спецыяліст адзначыла, што яе вырашэнне не запатрабуе вялікіх рэсурсаў ад саміх жыльцоў. Патрабаванні заканадаўства наўрад ці можна прызнаць "драконаўскімі": ніхто не вымагае ад людзей нейкай "адмысловай" сталяркі, выкананай па індывідуальных праектах. Дый нават і тыя "няправільныя" вокны, што былі ўжо ўсталяваны, зусім неабавязкова замяняць на новыя — дастаткова проста перафарбаваць іх рамы ў адпаведны фасаду колер. Выдаткі — мізэрныя, але... Многія ўсё адно лічаць за лепшае "змагацца да апошняга"...

Наталля Радчанка ўсё ж спадзяецца, што паразуменне з жыльцамі ўдасца дасягнуць мірным шляхам. Тым болей, іншыя шляхі нават цяжка пакуль уявіць: "сталярныя" парушэнні ў Мінску сталі настолькі масавымі, што прыцягнуць усіх вінаватых да адміністратыўнай адказнасці аднаму спецыялісту з Мінгарвыканкама немагчыма нават фізічна.

— Кожны такі выпадак вымагае нямала часу, — кажа Наталля Радчанка. — Патрэбны і сведкі, і фотафіксацыя, і нямала іншых фармальнасцяў. Адпаведна, без дапамогі тых жа ЖРЭА нам не абысціся.

Сапраўды, камунальныя службы і "бліжэй да зямлі", і штат іх куды большы, але... у плане аховы спадчыны гэтыя арганізацыі іначай, як няпрофільнымі, не назавеш. Ці справяцца яны з новымі абавязкамі?

На думку Наталлі Радчанка, нічога складанага ў тым, каб адрозніць "правільныя" вокны ад "няправільных", у прынцыпе, няма: зрабіць гэта можна проста "на вока".

— Калі не будзе кантролю на месцах, калі не з'явіцца сістэма пастаяннага маніторынгу, выніку не атрымаем, — перакананы Аляксандр Ленкаў.

І сапраўды, парушэнні можа ліквідаваць такая самая сістэма іх прафілактыкі ды выкаранення, дзе кожны яе "вузел" — ад міністэрства і да ЖЭСаў — будзе выконваць уласную функцыю. Хочацца спадзявацца, што сталіца Беларусі стане "вопытнай пляцоўкай", дзе будзе апрабаваны сам механізм вырашэння "аконнай" праблемы. Натуральна, вялікую ролю тут мае адыграць і пазіцыя мэрыі. Тым болей, такія "дробязі" не абыяк уплываюць на ўяўленне і пра помнік спадчыны, і пра горад, у якім ён знаходзіцца, дадаючы ў той свет, дзе ўсе мы жывем, яшчэ адно каліва дысгармоніі.

Ілля СВІРЫН



Як “Латарэя” стала падзеяй

6 снежня гала-канцэртам лаўрэатаў завяршыўся Міжнародны конкурс піяністаў — выканаўцаў славянскай музыкі з аркестрам імя С.Манюшкі. Перамагла на ім — Музыка. І рашэнне журы не выклікала ніякіх сумневаў ці спрэчак.

Конкурс рыхтаваўся ў надзвычай сціслыя тэрміны. Міністэрства культуры Беларусі здолела ажыццявіць арганізацыйны працэс літаральна за тры тыдні. Дый сама прапанова (а хутчэй, пажаданне) правесці спаборніцтва ў Мінску была выказана прапраўнучкай вялікага кампазітара, старшынёй Французскай асацыяцыі С.Манюшкі, прафесарам Парыжскай нацыянальнай кансерваторыі Кларай Манюшка ўсяго год таму, калі яна завітала на зладжаную ў нашай філармоніі прэм’еру ранняй оперы свайго прапрадзеда “Латарэя”. Ранейшыя тры Фартэпіянныя конкурсы імя С.Манюшкі праходзілі ў Францыі, журы там узначальваў мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі, прафесар Юрый Гільдзюк. Але тыя спаборніцтвы былі сольнымі, цяперашняе ж — з аркестрам. Таму конкурс па праве можа лічыцца Першым. І ўсе мараць, каб ён стаў традыцыйным.

Статыстыка на конкурсах — не самае галоўнае. Важна — каб было паболей сапраўды дзеючых асоб і паменей “статыстаў”. У гэтым сэнсе цяперашняе спаборніцтва папраўдзе ўдалося. Добра папрацавалі тыя, хто ажыццяўляў папярэдні адбор удзельнікаў — у Польшчы, па дасланых DVD. Гэты адбор не праходзіла толькі Надзея Герасімава — як пераможца леташняга “сольнага” конкурсу імя С.Манюшкі ў Парыжы. І тое, што яе цяперашняе выкананне (не толькі ў конкурсе, але і на канцэрце адкрыцця) уразіла меней, чым выступленні астатніх, — дадатковае сведчанне: прыпынак у творчасці азначае крок назад.

Гнацца за колькасцю ўдзельнікаў не мела сэнсу яшчэ і таму, што кожны канкурсант, паводле рэгламенту, павінен быў атрымаць гадзіну рэпетыцыі з аркестрам. І на Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі прыпала па пяць-шэсць інструментальных канцэртаў на дзень. Але аркестравае суправаджэнне было выдатным, што не стамляліся адзначаць удзельнікі і члены журы. Музыканты на чале з Андрэем Галанавым не проста годна выконвалі свае партыі, а ішлі следам за салістам і ягоным прачытаннем.

Клара Манюшка, выступіўшы артыстычным дырэктарам конкурсу, звяртала асаблівую ўвагу на праграму: “Ідэя гэтага конкурсу — з’яднаць не толькі саміх выканаўцаў, але і творчасць славянскіх кампазітараў. Таму хацелася, каб на ім гучала як мага больш розных твораў”. Атрымалася ж — адзінаццаць піяністаў (трое з Польшчы, па двое — з Беларусі і Расіі, па адным — са ЗША, Паўднёвай Карэі, Узбекістана, Японіі) і чатыры канцэрты для фартэпіяна з аркестрам: А.Дворжака, Першы С.Пракоф’ева, Другі Ф.Шапэна (яго іграліі тройчы), і Другі С.Рахманінава (выконвалі шэсць разоў).

Славянская душа ў “закрытым фармаце”?

Сапраўдным адкрыццём нават для спецыялістаў стаў Канцэрт Дворжака, які, на жаль, амаль не гучыць з канцэртнай эстрады. Тым больш, “прэзентацыя” гэтага твора паўднёвакарэйскай піяністкай Ванжунг Анжэлай Лі была праведзена з сапраўдным славянскім адценнем. Выканаўцы з Усходу часта здзіўляюць неверагоднай тэхнікай, але часам іграюць, бы добра адладжаны механізм. Тут жа мы пачулі не толькі філіграннасць, але і музычнасць россыпаў, славянскую мяккасць, настальгічнасць, асаблівы шарм. Менш пашанцавала Канцэрту Пракоф’ева. У выкананні Юкіко Фудзімуры яго прахалодная лірыка набыла цеплыню, але гэтай японскай піяністцы не хапіла пракоф’еўскай вастрыні і энергетыкі.

Па-рознаму трактаваўся Шапэн. Самая маладая канкурсантка, 16-гадовая Надзіра Дадамухамедава з Узбекістана выканала яго надзвычай шчыра, імпульсіўна, нават з нейкім юначым задорам. Дамініка Пешка з Польшчы — з ноткамі гераічнасці і імпэту, якія ярка кантрасталі пранікнёным лірычным астраўкам. Яе суайчыннік Лукаш Крупіньскі — з асаблівай выразнасцю, паэтычнасцю, вытанчанасцю, рамантычна імправізацыйнай манерай, фантастычнай кранальнасцю гуку (першая прэмія і спецпрыз “Спадчына” Акадэміі музыкі).

Не менш разнастайным аказалася і прачытанне Рахманінава. Расіянін Міхаіл Далгоў (другая прэмія) іграў настолькі “правільна” і амаль ідэальна, што не хапала хоць якой-небудзь разыначкі, якая парушыла б надта звыклую трактоўку. Амерыканец Пітэр Джон, узяўшы больш павольны тэмп, ператварыў яе ў гімн разважлівасці і прыгажосці, але пры гэтым пацярпела адзінства формы. Пшэмыслаў Вінніцкі з Польшчы падкрэсліў звонавасць, правёўшы яе з першых тактаў праз увесь твор і дасягнуўшы глыбокіх, насычаных гучанняў з абертонамі, яркасці, характарнасці вобразаў. У нашага Андрэя Шычко Канцэрт загучаў папраўдзе магутна і напорыста, ды амаль без кантылены. Другі беларускі ўдзельнік — Яўген Галанаў (трэцяя прэмія) — засяродзіўся на эмацыйных кантрастах, драматургічнай логіцы, але часам надта асцярожнічаў. Назіраючы за гэтым музыкантам не першы год, штораз радуешся яго творчаму росту, усё больш удумліваму выкананню, асэнсаванасці. У гэтым конкурсе ён, дарэчы, выратаваў “беларускую каманду”. Павінен быў удзельнічаць іншы выхаванец прафесара Людмілы Шаламенцавай, але захварэў, і Жэня літаральна за чатыры дні да конкурсу аднавіў у памяці рахманінаўскі канцэрт, які быў у яго рэпертуары. Зрэшты, адметнасць беларускай фартэпіяннай школы была адзначана старшынёй журы, народным артыстам Расіі Юрыем Слесаравым яшчэ на прэс-канферэнцыі, што папярэднічала конкурсу.

Конкурс, без перабольшванняў, стаў падзеяй. Але ж ці знайшла яна адпаведнае прызнанне? Ці былі скарыстаны напоўніцу багатыя магчымасці конкурсу як майстар-класа? Інфармацыю СМІ атрымалі на прэс-канферэнцыі ў суботу 3 снежня. Таму нават у штодзённыя выданні “анонсы” маглі патрапіць хіба ў нумар за аўторак, калі вынікі ўжо былі падведзены. Няма чаго здзіўляцца, што Канцэртная зала філармоніі, нягледзячы на вольны ўваход, была напаўпустой. І запоўнілася толькі ў аўторак, на ўзнагароджванні лаўрэатаў. Слухачы даведваліся пра конкурс часцей не з афіш, што з’явіліся акурат у дзень адкрыцця, а з вуснаў у вусны. Праўда, за пару гадзін да пачатку тэлефонныя запрашэнні раздаліся ў музычных навучальных установах, але ў гэты суботні час большасць навучэнцаў і выкладчыкаў ужо адпачывала. Інфармацыя пра ўдзельнікаў была змешчана адно ў буклетах, якіх ледзь хапіла на канкурсантаў, іх выкладчыкаў і журы. Для чаго ж тады, прабачце, філарманічны сайт? На ім так і не з’явіліся ні імёны ўдзельнікаў, ні расклад іх выступленняў адпаведна лёсаванню, ні пералік пераможцаў — толькі даты правядзення конкурсу і няпоўны склад журы. Пэўна, да Другога конкурсу грамадскасць будзе падрыхтавана лепей?..

На здымках: лаўрэаты конкурсу Лукаш Крупіньскі, Міхаіл Далгоў і Яўген Галанаў; члены журы Эльжбэта Стэфаньска-Клыш і Клара Манюшка.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Сімфанічны аркестр Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.К.Агінскага, выступіўшы ў сталічнай філармоніі, анансаваў, да ўсяго, будучую прэм’еру Маладзечанскага маладзёжнага музычнага тэатра: у лютым там з’явіцца канцэртная версія оперы Ж.Бізэ “Кармэн”.

Уладзімір Дзмітрук (Альфрэд) і Таццяна Каханоўская (Віялета) у “Травіяце” маладзечанцаў.

“Кармэн” і... Уладзімір

Гэты калектыў на чале з дырэктарам каледжа, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Рыгорам Сарокам — часты госць і ў замежжы. Гэтым разам з аркестрам выступілі вакалісты, прычым усе яны — былыя выхаванцы каледжа: ужо добра вядомы ў многіх краінах свету лаўрэат міжнародных конкурсаў Анатоль Сіўко, Андрэй Саўчанка (абодва яны будуць спяваць у “Кармэн” партыю Эскамільё) і саліст Марыінскага тэатра Вячаслаў Сулімскі. Акрамя Ж.Бізэ, гучала найпапулярная музыка Дж.Вердзі, П.Чайкоўскага, С.Рахманінава і інш. Публіка ж адчувала не проста “пазнаванне” знаёмых мелодый, а спробу падкрэсліць у іх самае запатрабаванае сучаснымі слухачамі — эмацыйны ўзлёт, пругкасць рытмаў.

Літаральна праз некалькі дзён “маладзечанская школа” атрымала яшчэ адно прызнанне: Уладзімір Дзмітрук — колішні выпускнік каледжа па класе вакалу Маргарыты Васілевіч, Альфрэд у маладзечанскай пастаноўцы “Травіяты” — стаў уладальнікам першай прэміі на V Міжнародным конкурсе оперных спевакоў “Санкт-Пецярбург”.

— Цяпер Уладзімір займаецца на 4-м курсе Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, — кажа Рыгор Сарока. — І хаця ён мінчанін, а ў нас толькі вучыўся, сувязей з маладзечанскімі аркестрам і тэатрам не губляе і дагэтуль. Менавіта ён, дарэчы, будзе спяваць у нашай “Кармэн” партыю Хазэ. А ў красавіку рушыць з нашым аркестрам на гастролі ў Эстонію.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі адбыліся Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Беларуская кампазітарская творчасць у сучасным свеце” і, адначасова, фестываль беларускай музыкі “Гукаварот”.

Музыка на экспарт?

Гукаварот Акадэміі “па пятніцах у чацвер”

Такое спалучэнне для гэтай творчай ВНУ не навіна: апошнім часам у такім фармаце тут ладзяцца штогадовыя навуковыя чытанні памяці Л.Мухарынскай. Падзеі ж цяперашняй “фестывальнай канферэнцыі” (ці, можа, “навуковага фестывалю”) сталі для многіх сапраўдным адкрыццём “новай”, “найноўшай”, па вызначэннях музыказнаўцаў, і раней невядомай беларускай музыкі — на шырокім фоне замежных здабыткаў, пра якія ішла размова на творчых сустрэчах з літоўскімі, польскімі, расійскімі і ўкраінскімі гасцямі.

Сучасная музыка нашых кампазітараў, як заўважыла прарэктар па навуковай працы БДАМ, кандыдат мастацтвазнаўства Наталля Аруцюнава, — гэта амаль “сейсмаграма” беларускай культуры. Здараецца, на “экспарт”, для замежных фестываляў і конкурсаў мы пастаўляем шыкоўную акадэмічную музыку, адпаведную найноўшым еўрапейскім тэндэнцыям. А нашы слухачы ўзрастаюць на “імпарце”, не заўсёды класічным у высокім сэнсе гэтага слова, ды творах тых айчынных аўтараў, якія ў стане самі займацца папулярызацыяй сваёй творчасці, прыкладаючы для гэтага неверагодныя намаганні. У выніку замежныя слухачы бываюць больш дасведчанымі ў нашай музыцы, чым мы самі.

На “Гукаварот” жа творы адбіраліся не самімі аўтарамі, як гэта часам бывае на філарманічных канцэртах, а куды больш прыдзірлівымі крытыкамі — студэнтамі-выканаўцамі ды іх выкладчыкамі. Арганізатары пайшлі па самым простым шляху: паглядзелі, што назапашана ў іх рэпертуары, — і з гэтага склалі праграму. Але які вынік! Прагучалі надзвычай арыгінальныя беларускія кампазіцыі, якія раней выконваліся хіба на прэстыжных замежных фестывалях ды конкурсах. У рамках аднаго з найбольш выбітных праектаў фестывалю — “Музычныя серады па пятніцах у чацвер” — адбыліся дзве прэзентацыі: Асацыяцыі маладых беларускіх кампазітараў пры Беларускім саюзе музычных дзеячаў і новага выканальніцкага калектыву — Belarus modern orchestra на чале з Канстанцінам Яськовым.

І на канферэнцыі, і на “круглым стале”, які падрахоўваў напрацоўкі фэсту, узнімаліся актуальныя тэмы — у тым ліку, на скрыжаванні музыкі з усім спектрам гуманітарных навук. Так, спраўдзіліся словы прывітання намесніка міністра культуры Беларусі Тадэвуша Стружэцкага, у якім ён выказаў спадзяванне, што “канферэнцыя стане чарговым крокам да ўключэння Мінска ў лік прызнаных сусветных цэнтраў развіцця акадэмічнага класічнага мастацтва і навукі”. Студэнцкая ж моладзь была настолькі ўзрушана прыкладам мэтраў, што праз дзень пасля канферэнцыі і фестывалю зладзіла свой праект “Закрыты фармат”: кампазітары паказвалі свае новыя творы, а ўсе прысутныя іх абмяркоўвалі, уступаючы ў дыскусію.

На здымку: кампазітары Максім Круглы і Вольга Падгайская.

Вядучы рубрыкі — Барыс КРЭПАК

Рэспубліканская мастацкая выстаўка "Я не самотны…", прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча, якая 7 снежня адкрылася ў сталічным Палацы мастацтва, сведчыць, перш за ўсё, пра тое, што вобраз вялікага паэта зямлі беларускай, "чалавека новай культуры" прыцягваў і прыцягвае ўвагу вельмі многіх мастакоў краіны. І тое зразумела. Дакранаючыся да паэзіі Багдановіча, быццам бы ачышчаем сябе ад усяго дробязнага, наноснага, марнага. Гэта, відаць, і дапамагло майстрам пэндзля, разца, штыхеля, габелена, керамікі стварыць своеасаблівы выяўленчы вянок паэту.

Л.Пятруль. "Над возерам".

Э.Рымаровіч. "Максім Багдановіч".

"Засвяціцца" побач з... "Зоркай Венерай"?

Візуалізацыя "зачараванага царства" і Максіма Багдановіча

С.Гумілеўскі. "А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю…".

Я ўглядваюся ў творы экспазіцыі і сэрцам адчуваю надзеі ды мары аўтара "Вянка", рамантычную акрыленасць ягоных вершаў, чую філасофскія роздумы пра вечнае і імгненнае, пра смерць і бессмяротнасць, паэтаву настальгію па радзіме і веру ў дабро людское. Кожны з мастакоў звяртае свой позірк у тое, што складае і драматычную гісторыю жыцця паэта, і сутнасць яго паэзіі. Разам з тым, многія з творцаў, "уступаючы" ў дыялог з Багдановічам, яго спадчынай, не менш пільна ўглядваюцца і ў сябе, у глыбіні сваёй душы, у навакольны сучасны свет — у свой час.

Экспазіцыя выстаўкі ўвабрала ў сябе шмат чаго: ад кампазіцыйных, пагрудных і паясных партрэтаў паэта, створаных І.Ціханавым, Э.Рымаровічам, Л. і С. Гумілеўскімі, А.Аракчэевай, В.Крукам, В.Барабанцавым, М.Купавам, М.Апіёкам, ды рознааблічнай ілюстрацыі да ягоных твораў — М.Басалыгі, Ю.Хілько, Я.Шатохіна, А.Лапіцкай, Г.Грака, ад карцін і пейзажаў мясцін, дзе жыў паэт (У.Уродніч, Б.Аракчэеў, І.Козел, А.Суша, М.Аўчыннікаў), да габеленаў Г.Крывяблоцкай, Л.Пятруль, Н.Пілюзінай, М.Барысенка, Л.Пуцейка, ад керамікі Т.Васюк, Т.Курачыцкай, Н.Яўглеўскай да сімволіка-алегарычных кампазіцый, прысвечаных Багдановічу, аўтарства С.Цімохава, Р.Таболіча, А.Савіча, Э.Агуновіча, А.Ярашэвіча. Ды што сказаць? З лепшых твораў па-сапраўднаму паўстае жывы, паўнакроўны вобраз паэта. Раскрываецца ён мастакамі ва ўсёй чалавечай дасканаласці. Мы адчуваем спагадлівасць яго ўтрапёнай, мяцежнай душы, сыноўнюю адданасць беларускай зямлі, светлую веру ў будучыню.

Так, на выстаўцы можна ўбачыць жывапісныя, скульптурныя і графічныя партрэты Багдановіча ў розныя перыяды яго жыцця. Але ёсць тут і нацюрморты, пейзажы, вобразатворы мясцін, дзе жыў і навучаўся паэт, кампазіцыі, навеяныя яго высокай гуманістычнай паэзіяй. Нягледзячы на розніцу метадаў і почыркаў, форм выканання, удзельнікаў Рэспубліканскай выстаўкі аб'ядноўвае імкненне асэнсаваць характар зямлі, якая нарадзіла такога сына, агульнасць паэтычнай атмасферы, лірызм, што часцяком пераходзіць у элегічны акорд. Духоўнае спасціжэнне Радзімы — вось як можна вызначыць сутнасць творчасці мастакоў, тых, хто шчыра і смела, адхіляючы надакучлівыя прыёмы, стэрэатыпы і штампы, шукае новыя паэтычныя асацыяцыі, свежыя інтанацыі, новыя аспекты ўспрымання паэзіі Багдановіча праз прызму сённяшняга дня.

Б.Аракчэеў."Яраслаўль".

Я.Шатохін. "Плакала лета, зямлю пакідаючы…".

Абагульняючы ўбачанае, падкрэслю: выстаўку можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі. Гэта — творы-біяграфіі і творы-характары. На жаль, псіхалагічных карцін-характараў, партрэтаў-характараў пакуль нямнога. Адна з прычын гэтага, на мой погляд, у тым, што не ўсе мастакі аднолькава адказна падыходзяць да вобраза класіка. Гаворка ідзе нават не пра ступень таленту, а менавіта пра мастакоўскую сумленнасць. Некаторыя аўтары, распрацоўваючы гэтую тэму, проста не гатовыя да яе ўвасаблення маральна. Вось прыйшла юбілейная дата — значыць трэба штосьці стварыць, каб "засвяціцца" на выстаўцы. Такія творы (іх нямнога) таксама ёсць у экспазіцыі. Думаю, што калі мастак распачынае асэнсоўваць "вобраз" Багдановіча, Купалы ці Коласа, ды і любога іншага вялікага чалавека, ён, перш за ўсё, павінен, як мінімум, любіць яго, ведаць жыццё, творчасць, сумненні, надзеі, драмы героя… Але гэта я кажу ў якасці "крытычнага адступлення", патрэбнага для будучыні.

Канешне, большасць твораў выстаўкі зроблена "па матывах" паэзіі Багдановіча: тут і яго Мадонны, і Зорка Венера, і горды Страцім-Лебедзь, і "кветачка-пралесачка" і "цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог", і "слуцкія ткачыхі", і месяц, які "выплываў над змрочнай, заснуўшай зямлёй", і "зачараванае царства" беларускай прыроды…

Гэта ўсё радуе, але хацелася, канешне, пабачыць на выстаўцы і тыя творы-рэтраспекцыі, якія ўпершыню мы пабачылі на выстаўцы, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння М.Багдановіча. Памятаеце? Творы "Памяці М.Багдановіча" М.Селешчука, "У краіне светлай" Л.Шчамялёва, "Наша ніва" Л.Асядоўскага, "А сэрца ўсё гукае да бацькоўскага краю" У.Тоўсціка, "Максім Багдановіч" А.Анікейчыка, "Прысвячэнне" А.Ксяндзова, фотарэпрадукцыі партрэтаў паэта, створаныя П.Драчовым і В.Ждановічам.

Ну а сёння… Сёння таксама можна шмат расказаць пра тое, што думаюць, адчуваюць мастакі, якія па-сапраўднаму душэўна сустрэлі юбілей паэта, як імкнуліся яны ўвайсці ў новае кола праблем самых розных, звязаных з вяртаннем нашых славутых імёнаў у выяўленчую прастору нацыянальнай культуры. Але лепш проста прайсці па выстаўцы і моўчкі, не парушаючы цішыні, пастаяць ля работ мастакоў. І пачуць голас паэта…

Барыс КРЭПАК

Адзінаццаць падарункаў

М.Ісаёнак."Рамонкі".

В.Касцючэнка."Нацюрморт".

У.Васюк."І пратрубіў анёл…".

У.Пракапцоў."Памяці Максіма Багдановіча. Апошні санет паэта".

8 снежня ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылася мастацка-літаратурная акцыя "У вянок Максіма", прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

Адбыліся выступленні ансамбля "Тутэйшая шляхта" БДУ, драматычнага гурта "Жывое слова" СШ № 125 г.Мінска, вучняў сталічнай СШ № 185. У выкананні Вячаслава Статкевіча прагучалі ўрыўкі з монаспектакля "У краіне светлай…"тэатра "Зніч".

Цікавую акцыю з нагоды юбілею Максіма Багдановіча зладзілі адзінаццаць нашых мастакоў, якія падарылі свае творы Нацыянальнаму мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь: Уладзімір Васюк ("І пратрубіў анёл…"), Тамара Васюк (дэкаратыўнае блюда "Паводле вершаў Максіма Багдановіча"), Мікалай Ісаёнак ("Рамонкі"), Васіль Касцючэнка ("Нацюрморт"), Кастусь Качан ("Канец зімы"), Мікалай Кірэеў ("Азёрны край"), Уладзімір Кожух ("Зоркавы збор"), Мікалай Мішчанка ("Аколіца"), Уладзімір Слабодчыкаў (мадэль памятнага знака Максіму Багдановічу), Алесь Суша ("Івянец").



Т.Васюк. Паводле вершаў Максіма Багдановіча.

У.Слабодчыкаў. Мадэль памятнага знака Максіму Багдановічу.

Дарэчы, ідэя гэтак адзначыць юбілей паэта належыць дырэктару Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміру Пракапцову, якія таксама, разам з калегамі, паднёс падарунак музею — сваё палатно "Памяці Максіма Багдановіча. Апошні санет паэта". Работа — першая жывапісная карціна, якую ён намаляваў яшчэ ў 1985 годзе, увайшоўшы ёю ў Вялікае мастацтва. Сам Пракапцоў лічыць яе адным з найлепшых сваіх твораў.

Б.К.

Zoom да сэрца: ад нябёсаў да зямлі

Два фотапогляды на “Ave Радзіма”

Фотавыстаўка гродзенца Аляксандра Ласмінскага ў галерэі “Панарама” Нацыянальнай бібліятэкі не толькі па дні, а нават па гадзіне супала з часам адкрыцця выстаўкі здымкаў Яўгена Казюлі ў Нацыянальным гістарычным музеі краіны.

А.Ласмінскі. “Мая Радзіма”.

“Пад небам Гродзеншчыны” — экспазіцыя з такой назвай была прадстаўлена на вядомай выставачнай пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі, размешчанай — сімвалічна — пад самым небам Мінска. Аляксандр Ласмінскі — старшыня Камісіі Гродзенскага гарсавета дэпутатаў па культуры, адукацыі і справах моладзі, дырэктар Тэлерадыёвяшчальнага канала “Гродна плюс”, старшыня Народнага фотаклуба “Гродна”, але, у дадзеным выпадку, у першую чаргу фатограф — прапанаваў гледачам серыю з паўсотні пейзажаў, зробленых з “вышыні птушынага палёту”.

Вядома, што дасведчаны фотааматар адразу ўзновіць у памяці падобны цыкл фатографа-краязнаўцы Сяргея Плыткевіча — і паралель цалкам заканамерная. Аднак Аляксандр Ласмінскі прызнаўся: “Мы знаёмыя з Сяргеем, і мне падаецца, што ён зусім не крыўдуе на мяне, паколькі ў ракурсе майго праекта — Гродзенская зямля”. Больш за 20 палётаў на верталёце здзейсніў Аляксандр Ласмінскі, каб падрыхтаваць свой праект, — і бачна, што яго памкненні ды азарт былі падмацаваны, у першую чаргу, пачуццямі пашаны, любові да радзімы. А амбіцыі…Ды, уласна, што без іх ажыццявілася б?

Я.Казюля. “Зімні пейзаж”.

Што ж уласціва “нябеснай” серыі Ласмінскага? Безумоўна, яскравасць колераў, асаблівая рытміка пейзажаў, знятых з вышыні, ды і — нечаканая прыгажосць знаёмага краю, якую, як кажуць класікі, часам зблізку і не ўбачыць. Менавіта гэтай няўрымслівасцю фатографа ў пошуках новых ракурсаў улюбёнага аб’екта і цікавая серыя. “Ave Гродна і гродзенскі край!” — нібыта ўзносіць працы сваім пачуццём патрыятызму фотамастак.

Нельга сказаць, што саступаюць у гэтым памкненні паказаць хараство роднай зямлі і здымкі Яўгена Казюлі. Старшыня Народнага фотаклуба “Мінск”, вядомы фотакарэспандэнт, Яўген Карпавіч у выстаўцы пад назвай “Сцежкі творчасці. Фрагменты” прапануе гледачу паглядзець на наш дом у “зямным” ракурсе, што не адмаўляе ўзнёсласці ці захаплення ў падыходзе да тэмы. Погляд фатографа тут скіраваны не толькі кудысьці ўдалечыню, але і ахоплівае бліжнія планы, даруйце за таўталогію, набліжаючы імі прадметы, людзей ці нават далягляды роднай зямлі.

У экспазіцыі прадстаўлены працы пачынаючы бадай з 1970-х. І ў подпісах да здымкаў разам з назвай абавязкова стаіць удакладненне, дзе была зроблена фатаграфія: “Пад святлом месяца”, Стаўбцоўскі раён, 1981 г.; “Вокны, як сумныя вочы”, Ветка, 1981, Залессе, 1986; “Ля студні”, вёска Завер’е, Браслаўскі раён, 1984… І гэтыя дробныя, на першы погляд, падрабязнасці нібыта ўдакладняюць гледачу каардынаты пэўных імгненняў. Варта адзначыць, што выстаўка знаёміць гледача з фрагментамі ўсёй творчасці аўтара: тут мы можам сустрэць фота не толькі беларускіх абшараў ці гарадоў. Але ж асноўны масіў — гэта радзіма: яе мінулае, цяперашняе. І тут тым больш цікава прасачыць, як, падавалася б, звычайны фотаздымак селяніна ці знаёмага пейзажу становіцца дакументам эпохі.

Кульмінацыяй экспазіцыі па праве лічыцца серыя фотапартрэтаў людзей, выявы якіх Яўген Казюля праз камеру захаваў ужо ў гісторыі. Васіль Быкаў, Сяргей Грахоўскі і побач з імі — ткачыха Марыя Каўтунова, разьбяр Пятро Зяляўскі, гусляр Максім Такушэвіч ды тая “Светлая бабуля” з Веткаўскага раёна, усмешку якой сёння ведаюць ужо не толькі аматары фатаграфіі. Што ж, кожны з мэтраў краязнаўчай фатаграфіі па-свойму кажа “Ave Радзіма” і мае рацыю.

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ.

Кліч: далёкі і блізкі

“Касмічныя” матывы ў Нясвіжскім палацы

У Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку “Нясвіж” працуе персанальная выстаўка габелена і батыка лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Ніны Пілюзінай, якая арганізавана Мінаблвыканкамам і Беларускім саюзам мастакоў. Яна называецца “Далёкі кліч”.



Н.Пілюзіна. “Таямнічы водбліск”.

Ніна Васільеўна па вобразе думак, творчай ментальнасці і абсалютнай самааддачы — глыбока беларуская мастачка. Аднак па душэўнай мяцежнасці, па патрабавальным імкненні да бясконцага і ўсеагульнага яна выходзіць далёка за межы ўласна “беларускасці”. Таму яе творчасць заканамерна ўспрымаць у кантэксце не толькі нашай сучаснай айчыннай культуры, але і ўсёй славянскай у цэлым. І гэта не перабольшанне. Любоў да ўсяго існага, чыстага, сапраўднага, зямля беларуская “пад белымі крыламі” і таямнічы Космас — вось тыя тры галоўныя кіты, на якіх грунтуецца мастацтва Н.Пілюзінай.

Народныя вытокі яе габеленаў і батыкаў, якія прадстаўлены ў экспазіцыі, відавочныя: яны заўважныя і ў тэматыцы, і ў прыхільнасці да фальклорных традыцый, і ў востра-сучасным спосабе вобразнага мыслення. Але было б памылкай бачыць у мастачцы такога наіўнага самародка, таксама як і спакушанага стылізатара. Часта ўмоўнасць алегарычнага вобраза альбо сімволіка, якая даходзіць да складаных абстрактных форм, аказваецца ў яе не менш пераканаўчай, чым адчувальная верагоднасць жыццёвых рэалій.

Але яна — менш за ўсё бытапісальнік. Ніна Пілюзіна — паэт, і навакольны свет яна бачыць вачыма творцы, для якога складаныя асацыятыўныя сувязі, сімвалічныя іншасказы, выяўленчыя гіпербалы, умоўнасці метафарычнага мыслення такія ж натуральныя, як і родныя мова. У яе творах моцна скрыжаваліся ўплывы этнасу і разнастайныя імпульсы еўрапейскага прафесійнага мастацтва, таму Пілюзіна — мастачка сучасная, з грамадзянскай спеласцю светапогляду, ускладнёнасцю духоўнага жыцця, характэрнымі для пачатку XXI ст. “Часы не выбіраюць”, — сказаў паэт Аляксандр Кушнер. Затое выбіраюць свае адносіны да іх, да часоў, — магла б сказаць Ніна Пілюзіна.

Вось пра ўсё гэта яе нясвіжская выстаўка, якая мае трошкі настальгічную назву “Далёкі кліч”. Кліч — у мінулае. Кліч — у дзень сённяшні. Вось я ўспомніў цяпер, у дні, калі мы святкуем 120-гадовы юбілей М.Багдановіча, яе даўні габелен “Ой, ляцелі гусі ды з-пад Белай Русі…”, які яна зрабіла ў Гурзуфе да 90-годдзя аўтара “Слуцкіх ткачых”. Успамінаю, як у сонечным коле гэтага габелена нечакана журботна засвяціўся кавалачак таго самага Крыма, да якога ў апошнія тры месяцы жыцця быў пяшчотна прывязаны наш вялікі паэт. Гэты твор сёння ўпрыгожвае экспазіцыю Усерасійскага музея дэкаратыўнага мастацтва ў Царыцыне, што пад Масквой. Нашы — і там таксама…

Б.К.

Н.Пілюзіна. “Жарты лёсу”.

Падняцца над рэальнасцю — “у вырай”

У галерэі “Мастацтва — выстаўка жывапісных работ мастака-графіка Раісы Сіплевіч пад назвай “Вырай”. Па словах самой мастачкі, яе творчасць уяўляе сабой “сінтэз рэальнага і эмпірычнага”. Творы адлюстроўваюць унутранае жаданне майстра спазнаць рэчаіснасць паўней і глыбей праз форму, колер, лініі, фактуры. Суб’ектыўна пераасэнсаваўшы вопыт мастакоў-мадэрністаў XX стагоддзя, Раіса Сіплевіч будуе свае кампазіцыі на аснове эмпірычнага пачатку, напаўняючы іх аўтэнтычнымі вобразамі і сімваламі.

Менавіта выпадковая пляма, як у майстроў ташызму, з’яўляецца асновай фармальнай пабудовы яе кампазіцый. Але мастачка пастаянна эксперыментуе і ідзе ўсё далей у сваіх фармальных пошуках, насычаючы кампазіцыі вобразамі рэальнага свету. Кантраснае супастаўленне абстрактнага і фігуратыўнага ў межах аднаго жывапіснага палатна надае яе работам ірэальна-сімвалічную афарбоўку, уводзіць гледача ў іншую, суб’ектыўна паэтычна пераасэнсаваную аўтарам рэальнасць. Як лічыць Раіса Паўлаўна, яе працы “далучаюць гледача да думкі, што за простым заўсёды хаваецца складанае, за формай тоўпіцца невядомыя энергіі, адно пранікае ў іншае”.

Р. Сіплевіч. “Быў летні вечар”.

На выстаўцы была прадстаўлена вялікая колькасць асацыятыўна-вобразных кампазіцый мастачкі, якія і з’яўляюцца асноўным напрамкам яе творчасці. Працуючы таксама ў жанры партрэта і пейзажа, аўтар смела парушае стылёвыя межы шляхам насычэння кампазіцый фантастычнымі выявамі і сімваламі, прататыпам і крыніцай натхнення для якіх з’яўляецца беларускі пейзаж, прырода роднага краю, нацыянальныя тыпажы. Самымі ўлюбёнымі з’яўляюцца вобразы птушак, матылькоў, стракоз і кветак. Карыстаючыся багатым арсеналам выяўленчых сродкаў, такіх як алегорыя, метафара і гіпербала, мастак напаўняе гэтыя вобразы нейкай чароўнай сілай. Напрыклад, птушкі на палотнах Раісы Сіплевіч заўсёды па-каралеўску велічныя, сапраўдныя цары прыроды Беларусі (“Легенда пра Птушку”, “Калядная птушка”, “Быў летні вечар”). Таксама можна заўважыць вялікую любоў мастачкі да жаночых вобразаў, часам іх можна інтэрпрэтаваць як аўтапартрэты (“Каралева”, “Князёўна”, “Танец з матылькамі”). Часцей за ўсё аўтар аддае перавагу адлюстраванню жаночых вобразаў і вобразаў прыроды ў межах аднаго жывапіснага палатна: працы “Жар-Птушка”, “Першы снег”, “Сон у зімнюю ноч”. Таксама Раіса Сіплевіч стварае абстрактныя кампазіцыі. Дынамічныя і палкія па выкананні, яны, у асноўным, тычацца тэм прыроды і чалавечага існавання (“Паміж наступным і былым”, “Хваля”, “Таемная непазбежнасць”, “Танец белага матылька”).

Падняцца над рэальнасцю, узяўшы толькі самае лепшае, і гіпербалізаваць гэтае лепшае — вось сапраўдны дар Раісы Сіплевіч: яе працы поўныя цеплыні, чысціні і пазітыўнай энергетыкі.

Вераніка ЮРЭВІЧ-МАЛАШЧУК

У Магілёўскім абласным драматычным тэатры адбыўся паказ мастацтва пантамімы, пластычных спектакляў і мініяцюр, не ўласцівых гэтай сцэне. І хаця ён называўся ўсяго толькі "Вечар невербальнага мастацтва", паводле сваёй ідэі і разгорту гэта быў, па сутнасці, аднавечаровы... фестываль, які з'яднаў мінскіх, магілёўскіх і пецярбургскіх прафесійных акцёраў ды аматараў.

Не маўчаць!

Бачанне ў прасторы жэста

Невербальны — значыць, бязмоўны? Так, але ёсць у гэтага слова яшчэ адзін сэнс: невербальны — той, які нельга выказаць словамі — толькі пластыкай ды музыкай пачуццяў. І каб настроіць на гэта публіку яшчэ да таго, як яна зойме свае месцы ў зале, гледачоў сустракалі дзяўчаты і юнакі, якія жэстамі прапаноўвалі адчуць водар уяўнай кветкі, сфатаграфавацца на нябачную камеру ці проста ўсміхнуцца. А маладая фотамастачка, якая ўзяла сабе псеўданім Джэйн Эн Пі, парадавала гасцей сваёй першай фотавыстаўкай, дзе былі прадстаўлены зоркі рок-сцэны ў арыгінальным бачанні аўтара.

Санкт-Пецярбургскі тэатр з крэатыўнай назвай "Тэатр Імя, Якога… нельга называць" паказаў спектакль "Фокус", заснаваны на спалучэнні святла і ценю, акцёрскай пластыкі і лялек (рэжысёр — Дзмітрый Казенас). Артысты прымусілі гледачоў не толькі думаць і спачуваць, але і… сачыняць сюжэт разам з імі. Сярод удзельнікаў былі і клоўнскі дуэт "Чаманары" ў складзе братоў Віталя і Леаніда Фурманавых, і кіраўнік тэатра пантамімы "ІнЖэст" Вячаслаў Іназемцаў з філасофскай прытчай у стылі традыцыйнага японскага танца "буто". Першакурснікі Магілёўскага каледжа мастацтваў пад кіраўніцтвам Таццяны Матусевіч прапанавалі пластычную мініяцюру "На крылах надзеі".

Ды ўсё ж візітоўкай вечара стала выступленне не прафесіяналаў ці навучэнцаў, а аматарскага тэатра-студыі Магілёўскага таварыства глухіх "Шостае пачуццё" са спектаклем "Жыццё цудоўнае". Акцёры размаўлялі пры дапамозе азбукі глухіх, а для гледачоў, якія ёй не валодаюць, тэкст агучваўся. Фактычна гэта быў урок, у якім Анёл, выразна сыграны Ганнай Парадзінай, тлумачыў, што самае важнае ў чалавечых стасунках — гэта пачуцці, якія ахінаюць людзей у адказ на нашы ўчынкі. Вось і галоўную гераіню ў выкананні Валянціны Карповіч Анёл "судзіў" не за дабро ці зло, а за тыя адчуванні, што яна выклікала ў людзей на працягу свайго багатага на прыгоды жыцця.

Чырвонай ніткай праз увесь вечар праходзілі выступленні шоу-групы "Арцель камедыянтаў", якія не толькі весялілі гледача, але і прымушалі яго задумацца. Завадатарам выступаў кіраўнік гурта і яркі артыст Яўген Мельнікаў, вядомы магіляўчанам пад сцэнічным псеўданімам Жан. Менавіта ён стаў ініцыятарам гэтай нязвычнай культурнай акцыі і прыцягнуў да ўдзелу многіх неабыякавых да сцэнічнага мастацтва людзей. Арганізацыйныя ж праблемы вырашыў ужо вядомы магіляўчанам творчы цэнтр "АртФэст". А сам праект быў прысвечаны 80-годдзю Беларускага таварыства глухіх, і арганізатарам удалося запрасіць да ўдзелу менавіта тых акцёраў і пастаноўкі, якія без слоў данеслі галоўнае: трэба любіць жыццё і людзей, нават калі яны адрозніваюцца ад вас. Ці ж гэта не ісціна для ўсіх?

Ганна ПАЯРКАВА
Магілёў

На здымках: сцэны са спектакляў тэатра "Тэатр Імя, Якога... нельга называць" і шоу-групы "Арцель камедыянтаў".

Мэсідж "Я хачу дадому!"

Пінскі погляд на "сацыялку"

Мне ўжо даводзілася пісаць на старонках "К" пра гэты маладзёжны калектыў. І вось новая хваля ўражанняў пасля наведвання Палескага драматычнага тэатра ў Пінску. Гэтым разам пабывала на спектаклі "Я хачу дадому!" паводле п'есы Л.Разумоўскай.

Слова "маладзёжны" ўжыта вышэй зусім не выпадкова, паколькі і на сцэне, і ў зале — прадстаўнікі менавіта гэтай узроставай катэгорыі. Зрэшты, да яе апелюе і пастаноўшчык Павел Марыніч. Адсюль пытанне: што ж мы бачым на сцэне? Трагедыю зусім юных, згубленых усімі маладых людзей, што страцілі, да ўсяго, і саміх сябе на зломе стагоддзяў.

У сцэнаграфіі — нічога лішняга, аднак менавіта яна і з'яўляецца пэўным складнікам асабістасці сцэнічнага выказвання трупы. Наўкол — пустэча, што толькі візуальна трансфармуецца ў неабходныя ўзвышэнні, памост, які, папраўдзе, нярэдка асацыіраваўся з пагостам. І музыка, і рэжысёрская трактоўка гучаць узвышанай нотай дабра, што мусіць разбурыць Вавілонскую вежу. Сацыяльны пасыл спектакля тут на першым плане.

Што да акцёраў, дык у Палескім драматычным, па вялікім рахунку, яны бяруць менавіта ансамблевай ігрой. Зрэшты, практычна ўсе спектаклі тэатра, заснаванага Іванам Базанам, уражваюць менавіта гэтым. У "Я хачу дадому!" запомніліся трактоўка паслушніка-Венькі маладога артыста Паўла Рыжова, трагічны лёс на сцэне пражывае Юлія Брылёва, скалечаную душу паспяхова і моцна перадае характарная актрыса Алена Андрэева. Ды і ў ролях Антаніны Ракала і Андрэя Дзмітрычэнкі адчуваеш ноткі трагізму...

...Што дадаць? Хіба колькі слоў пра творчыя планы. Моладзь тэатра з лістапада распачала пастановачны працэс майскай прэм'еры Палескага драматычнага — п'есы Янкі Купалы "Раскіданае гняздо" ў рэжысуры таго самага Паўла Марыніча.

Святлана ЯФРЭМАВА
Дзяржынск

На здымку: сцэна са спектакля "Я хачу дадому!"

Пазачасавы раман: версія "Людзей на балоце"

У лютым знакаміты раман Івана Мележа "Людзі на балоце", якім распачынаецца трылогія пісьменніка "Палеская хроніка", у чарговы раз стане спектаклем Купалаўскага. Праўда, пад гэтай назвай схаваецца сюжэтная лінія не толькі першай, але і другой часткі трылогіі — "Подых навальніцы".

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Як паставіць класіка, маючы "двухразовы" мележаўскі вопыт?

— Праца над спектаклем, — кажа рэжысёр Аляксандр Гарцуеў, — у самым разгары. Мастаком запрошаны Ігар Анісенка. Ён стаў ужо, можна сказаць, масквічом, але ў гэтым спектаклі — у нашай камандзе. Музыку піша Дзмітрый Фрыга, які паралельна працуе з Андрэем Курэйчыкам над кінафільмамі. Так што праца ідзе і нават знаходзіцца на піку.

— А як размеркаваліся ролі? Колькі, дарэчы, у вас будзе акцёрскіх складаў?

— Два. Але Васіля, думаю, сыграюць трое артыстаў: Раман Падаляка, Аляксандр Паўлаў і зусім малады Павел Астравух. Ён прыйшоў у наш тэатр у гэтым сезоне, пачаў з невялічкіх роляў у "Паўлінцы", "Каханні ў стылі барока", "Ночы на Каляды", выходзіў у ролі нямецкага салдата ў маім спектаклі "Не мой" — і зараз спрабуе ўвасобіць няпросты характар Васіля.

— Ганнай, пэўна, стане ваша дачка Валянціна? Яна натуральна пачувае сябе не толькі ў лірычных і камічных ролях. Мяркуючы па яе глыбокім, псіхалагічна тонкім пранікненні ў няпростыя характары Людмілы ў "Дзецях Ванюшына", Паліны ў згаданым вамі спектаклі "Не мой" і асабліва Франкі ў "Хаме", гэта роля — акурат для яе.

— Ганну сыграе таксама Вікторыя Чаўлытка. Яўхіма — Павел Харланчук.

— А старэйшае пакаленне? Гэтыя акцёры заўсёды ствараюць асаблівую атмасферу.

— Глушака ўвасобяць Генадзь Аўсяннікаў і Сяргей Краўчанка. Глушачыху — Наталля Качаткова і Тамара Міронава.

— І ў кожнага артыста, зыходзячы з яго індывідуальнасці, атрымаецца свой персанаж. Здаецца, гэта будуць не проста два склады, але і два розныя спектаклі. Дарэчы, чаму вы не выкарысталі ранейшую інсцэніроўку? Гістарычны эпас Івана Мележа калісьці ўжо ўвасабляўся на купалаўскай сцэне.

—Так, гэта быў спектакль, паставлены Барысам Эрыным. Я таксама ў ім іграў — як кажуць, "па маладосці", таму добра яго памятаю. Інсцэніроўку рабілі Тамара Абакумоўская і Зінаіда Браварская. Пачынаючы працу, я хацеў перагледзець той тэкст, але за 40 гадоў ён, відаць, папросту згубіўся ў архівах тэатра, бо мы яго не знайшлі. А калі б і знайшлі, усё роўна, мяркую, рабіў бы новую інсцэніроўку. Бо час ідзе, і хаця сам твор Мележа застаецца тым жа, змяняецца нашае прачытанне яго. Раней у ім акцэнтаваўся разлом эпох, каханне ж праходзіла хіба фонам. У мяне ж, наадварот, менш падкрэсліваюцца працэсы калектывізацыі, больш — каханне. Бо гэта папраўдзе вечнае пачуццё, якое хвалюе людзей незалежна ад часу і прасторы — ва ўсе эпохі і на любой тэрыторыі.

— Многія, дарэчы, памятаюць і кінастужку Віктара Турава...

— Я таксама ў гэтым фільме ўдзельнічаў. Там было шмат прыгожых краявідаў і ўвогуле прыроды. Але я раблю свой спектакль. Ён — найперш пра людзей. Многія пытаюць мяне: чаму, маўляў, Мележ, навошта сёння "Людзі на балоце"? Гэта добры беларускі матэрыял, наша класіка. І яна, як і тэма кахання, ужо знаходзіцца ў пазачасавай прасторы: кожнае новае пакаленне будзе знаходзіць у ёй штосьці сваё.

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымку: Валянціна Гарцуева і Раман Падаляка ўжо маюць вопыт ігры ў дуэце ў спектаклі "Translations".

На старонках "К" мы не аднойчы звярталіся да актуальных пытанняў існавання народных тэатраў. Гэтым разам чарговую нагоду для працягу размовы даў VI Фестываль аматарскага тэатральнага мастацтва "Святло рампы", які днямі завяршыўся ў Магілёве і сабраў дванаццаць творчых калектываў горада і ўсёй рэспублікі. Акрамя традыцыйнага конкурснага "спаборніцтва" паміж калектывамі, магістральнай тэмай "Святла рампы" стаў своеасаблівы комплексны маніторынг таго, якім жа чынам развіваецца сёння аматарскае тэатральнае мастацтва, у якіх накірунках яно бачыць свае перспектывы і што з былых традыцый у сучасных рэаліях цалкам страчвае сваю актуальнасць? Тым больш, што аматарскі статус сам па сабе, з аднаго боку, абавязвае больш пільна і трапятліва ставіцца да гэтага занятку, але ж з іншага — не дае аніякіх гарантый і стабільнасці ў плане забеспячэння самога творчага працэсу.

Шукайце... мужчыну на магістральным маніторынгу

Актуальныя тэндэнцыі аматарскай сцэны без "апендыксаў" і стэрэатыпаў

Разбурэнне міфалогіі

Прыемна было адзначыць, што пад час фестывалю былі абвергнутыя некаторыя стэрэатыпы, якія традыцыйна прымяняліся да сферы аматарскага тэатра. Адзін з іх — надзвычайны дэфіцыт у народных тэатрах мужчын: маўляў, усе яны займаюцца заробкам грошай і не маюць часу на акцёрства. Аказалася, што ў рэальнасці сітуацыя выглядае зусім інакш: часам, назіраючы за выступленнямі калектываў, думалася, што фактуры і палкасці сцэнічнага існавання не аднаго з акцёраў-аматараў маглі б пазайздросціць многія з прафесійных рэгіянальных тэатраў. Прычым, што прыемна, значную катэгорыю складаюць людзі, так бы мовіць, сярэдняга ўзросту — тыя, хто ўжо мае пэўную прафесійную ды побытавую стабільнасць і на гэтым фоне знаходзіць для сябе ў тэатры дадатковую аддушыну для ўласных творчых праяўленняў.

Яшчэ адзін міф, які на паверку аказваецца ўсяго толькі зручнай пазіцыяй для таго, каб нічога не рабіць, — тэзіс пра адсутнасць у аматараў годнай для пастаноўкі драматургіі. Афіша фестывалю паказала, што галоўная рэпертуарная "праблема" — адсутнасць імпэту ў кіраўнікоў калектываў. І гэта яскрава высвеціў досвед тых удзельнікаў фестывалю, якія, як магілёўскія народны тэатр Палаца культуры вобласці са спектаклем "Выйсце крыніц" У.Караткевіча альбо народны яўрэйскі тэатр "Шалом" з пастаноўкай "Вуліца Шалом-Алейхема, 40" А.Ставіцкага, знайшлі для сябе цікавы матэрыял сярод класічных твораў. Альбо, як народны тэатр з Жодзіна са спектаклем "Аднакласнікі" Ю.Палякова ці народны тэатр з Брэста са спектаклем "Свінячыя выбрыкі" А.Богдана, накіроўваюць увагу ў бок сучаснай драматургіі, у тым ліку і беларускай, дзе можна адшукаць тэмы, актуальныя і сугучныя з днём сённяшнім. Ці, прыкладам, можна было б узяць на ўзбраенне вопыт народнага маладзёжнага тэатра "Легіён" з Мазыра. Пераважная частка яго рэпертуару ствараецца кіраўнікамі калектыву адмыслова з улікам творчых магчымасцей трупы.

Аматарскі тэатр — гэта...

Як зазначыў старшыня журы, рэжысёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Віктар Куржалаў, дыяпазон тэатральных работ, прадстаўленых у фестывальнай афішы, з'яўляецца своеасаблівым адлюстраваннем тых запатрабаванняў, якія сённяшні актыўны глядач прад'яўляе да тэатраў прафесійных. Іншымі словамі, усе тыя крытычныя заўвагі, што прафесіяналы звычайна прад'яўляюць аматарам, на самой справе — патрабаванні гледачоў-аматараў да рэпертуарных тэатраў, да таго, што яны жадаюць убачыць на сцэне.

У гэтым сэнсе відавочна вылучаюцца дзве тэндэнцыі. Першая — імкненне да "паўнавартаснага" тэатральнага дзейства, дзе будзе дастаткова магчымасцей для выкарыстання эфектных візуальных сродкаў (багатых дэкарацый, відэапраекцый, што актыўна пранікаюць і ў аматарскі тэатр, і г.д.), актыўная экспансія элементаў кінематографа і шоу-бізнесу, да якіх прафесійныя тэатры прывучаюць сваіх гледачоў на працягу апошніх дзесяці-пятнаццаці гадоў. Другая — кірунак у бок вяртання на сцэну тэатра моцных псіхалагічных перажыванняў, якія забяспечваюцца коштам драматургічнага напружання, вострых дыялогаў і палкіх маналогаў, закліканых стварыць уражанне пераемнасці традыцый класічнага псіхалагічнага тэатра. І адзін, і другі кірункі маюць як відавочныя плюсы, так і прыхаваныя падводныя камяні, якія выплываюць тады, калі знешняя форма засланяе галоўную, сутнасную прыроду тэатральнай творчасці — уменне наладжваць на сцэне кантакт паміж персанажамі.

Традыцыі і мода

Калі хтосьці засумняваецца ў тым, што аматарскі тэатр — гэта модна, варта толькі пазнаёміцца з мазырскім "Легіёнам", і сумненні знікнуць цалкам. Актыўны малады калектыў, сярэдні ўзрост удзельнікаў якога набліжаецца да 40 гадоў, прадэманстраваў усім прыхільнікам фестывалю не толькі творчы імпэт, якога, балазе, было на "Святле рампы" дастаткова, але і сучасны маркетынгавы падыход, чаго часам так не стае іншым аматарам, прычым не толькі ў галіне тэатральнага мастацтва. Пра сур'ёзнасць творчых прэтэнзій і грунтоўнасць уласных намераў мазыране заявілі не толькі пастаноўкай спектакля "Пра Фядота" Л.Філатава, але ж і адносінамі да свайго занятку, тым драйвам, які яны прывезлі ў Магілёў — разам з рэкламнай прадукцыяй у выглядзе яркіх праграмак, прома-дыскаў, банера з партрэтамі акцёраў тэатра. А ўжо завітаўшы на інтэрнэт-сайт "Легіёна", можна пазнаёміцца з амаль вычарпальнай інфармацыяй аб самім калектыве. Думаецца, уся гэтая дзейнасць, якую праводзіць мазырскі калектыў, — цудоўны ўзор для пераймання ўсім тым, хто вырашае, з чаго ж пачаць папулярызацыю ўласных творчых эксперыментаў і пошук сталай базы для існавання. Перадусім, не толькі матэрыяльнай, але і ідэалагічна-творчай.

У гэтым сэнсе цікавым калектывам — удзельнікам "Святла рампы" стаў народны тэатр з Брэста, які сёлета адзначае сваё 50-годдзе. Калектыў, які працуе на базе ДК Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі, аказваецца, "сумясціў" у адным выступленні ажно два фестывалі — "Святло рампы" і фестываль-конкурс "чыгуначных" народных тэатраў. Прадэманстраваўшы, што падобныя калектывы ў рамках такіх ведамасных структур, як Беларуская чыгунка, не толькі не з'яўляюцца чымсьці накшталт "апендыксаў", а наадварот, маюць магчымасць развівацца і наладжваць кантакты не толькі на творчым, але нават і на карпаратыўным узроўні. А гэта значыць, што творчая ініцыятыва здольная даваць плён у любым структурным "атачэнні", галоўнае — шчырае і пастаяннае жаданне займацца тэатральнай творчасцю.

Падвядзенне фестывальных вынікаў для журы — рэч заўсёды няпростая, асабліва, калі на абмеркаванне прадстаўленыя не прафесіяналы, патрабаванні да якіх вядомыя і зразумелыя, а аматарскія групы, кожная з якіх кіруецца ў сваім творчым руху пэўнымі задачамі, важнымі і актуальнымі, магчыма, толькі для яе асабістага жыцця. І той факт, што тэатры — удзельнікі "Святла рампы" ўжо адным сваім удзелам у конкурсе сталі пераможцамі, не выклікае аніякіх сумненняў.

Ды ўсё ж выбар журы, якое Гран-пры фестывалю прысудзіла ўзорнаму тэатру "Рэха" ДШМ № 1 г.Магілёва за спектакль "Хлопчык на даху, або Дзіравы парасон" К.Ткачовай, стаўся для многіх канкурсантаў нечаканасцю. Здавалася б, у параўнанні з яркімі і маштабнымі пастаноўкамі аршанскіх аматараў, мазыран, жодзінцаў ці іншых калектываў-удзельнікаў, магілёўскія школьнікі выглядалі вельмі сціпла і някідка. Аднак ім, разам з кіраўніком Наталляй Дурэйка, удалося схапіць, адчуць і прадэманстраваць нам, гледачам, адну з найважнейшых задач, якія вырашаў і мусіць вырашаць ва ўсе часы тэатр, — уменне наладжваць кантакт паміж людзьмі. Уменне бачыць і чуць адзін аднаго на сцэне, размаўляць з дапамогай аўтарскіх дыялогаў, а не прамаўляць іх — вось тыя азы, дзякуючы якім сціплае з пункту гледжання яркасці і кваліфікацыі сцэнічнае дзеянне сталася такім глыбокім і важным. І калі дзякуючы такім аматарскім спектаклям, як гэты, людзі не толькі на сцэне, але і ў глядзельнай зале навучацца бачыць і чуць адзін аднаго, можна лічыць, што высокая місія тэатральнага мастацтва выканана.

Таццяна КОМАНАВА,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Магілёў — Мінск

На здымку: сцэна са спектакля "Хлопчык на даху..." тэатра "Рэха".
Фота Васіля ЦІТОВА

Лічбы і факты

Паводле інфармацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, на 7 снежня 2011 года ў краіне існуе 2871 аматарскі калектыў тэатральнай творчасці. Сярод іх 1815 — дзіцячыя. Усяго ў падобных тэатрах удзельнічаюць 28727 чалавек, больш за 18 тысяч з якіх — дзеці. Аматарскіх калектываў тэатральнай творчасці, што маюць званне "народны" ці "ўзорны", у Беларусі на сёння 176. Шэсць народных тэатраў уганараваны найменнем "заслужаны".

Са свету па... ёлцы

Да 14 снежня можна падаць заяўку на... упрыгажэнне навагодняй ёлкі для... Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Ці не зашмат шматкроп'яў у адным сказе? Падаецца, не, паколькі музей ужо некалькі гадоў запар штосезон прапануе арыгінальны інтэрактыўны праект. Скажам, летась узімку адну з залаў установы запоўнілі плюшавыя мядзведзікі. Сёлета ж навагодні час там пройдзе з зялёнымі красунямі, упрыгожанымі ў рамках акцыі "Са свету па ёлцы" самым арыгінальным чынам.

Як зазначаюць у музеі, конкурснае дрэўца мае быць упрыгожана на пэўную тэму, у стылістыцы якой-небудзь эпохі або краіны. Дарэчы, першым дваццаці сем'ям, што падалі заяўкі на ўдзел, музей прапануе загадзя падрыхтаваныя ёлачкі для эксперыментавання.

А 5 студзеня 2012-га адбудзецца прэзентацыя зімовых красунь і падвядзенне вынікаў конкурсу, галоўны прыз якога — падарожжа ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу.

Тэст на "Рукатвор"

У Малой зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася выстаўка беларускага каліграфа, кніжнага дызайнера Генадзя Мацура "Рукатворы".

Зазначым, што падобны від графікі ў айчынных выставачных залах — не часты госць: за апошнія колькі гадоў згадаюцца хіба адна-дзве персанальныя экспазіцыі айчынных каліграфаў.

Дык што ж такое каліграфія: рамяство, мастацтва, філасофія, дух? Адказ на гэтае пытанне ў сваім праекце і спрабуе знайсці мастак. Выхаванец Мінскага мастацкага вучылішча імя А.К. Глебава, Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, лаўрэат нацыянальных і міжнародных конкурсаў мастацтва кнігі, Генадзь Мацур мае досвед для слушнага адказу.

Усе "Рукатворы" на выстаўцы ідуць "ад рукі", хоць і з дапамогай розных прылад — ад традыцыйных пяра, пэндзля і паперы да камп'ютарнай графікі. Праект падзяляецца на тры часткі. Першая — росчыркі, малюнкі-лініі, што ўяўляюць з сябе асацыяцыі і вобразы. Другая — канкрэтныя літары ці алфавіты, у аснову якіх пакладзены скорапіс — пісьмо, што было распаўсюджана на беларускіх землях у XVI стагоддзі. Трэцяя — словы і тэксты, творы з радкамі Святога Пісання, цытатамі знакамітых людзей, асобныя назвы і паняцці.

Высветлім "...адносіны"?

Цягам дзесяці дзён — да 12 снежня — у мастацкай галерэі "Акадэмія" Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў будуць высвятляць "Няпростыя адносіны".

Менавіта так называецца персанальная выстаўка мастака Васіля Зянько, які ў новым праекце звяртаецца да тэмы ўнутранага свету чалавека. У прыватнасці, творцу цікавяць эмоцыі, якія часцяком кіруюць асобай. А прадстаўляе іх Васіль Зянько ў вобразах птушак і жывёл. Поруч жа з карцінамі паўстануць... птушыныя клеткі ў выглядзе сэнсавых арт-аб'ектаў.

Работы мастака выкананы ў арыгінальнай аўтарскай тэхніцы, адрозніваюцца індывідуальным колеравым рашэннем, пластыкай формы, багатай фактурай.

"Культура-інфа": "гарачая лінія"

СТВАРЫЦЕ Ж БРЭНД ДЛЯ РЭГІЁНА!

На пытанні чытачоў і журналістаў "К" адказвае намеснік начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Святлана ГАЎРЫЛАВА

(Працяг. Пачатак на стар. 3.)

Яўген РАГІН:

— Ці ёсць у вас прэтэнзіі да дзейнасці Рэспубліканскай Рады дырэктараў музеяў?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Гэтай грамадскай арганізацыяй кіруе дырэктар Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Азаронак. Шмат пытанняў мы сумесна змаглі вырашыць, але ў Раду не ўваходзілі прадстаўнікі рэгіянальных музеяў. Гэтае пытанне скарэктавалі праз асобны артыкул у Законе. Загадам Міністра культуры зацверджаны новы склад Рады, яго дзейнасць набудзе больш сістэмны і планавы характар. І, безумоўна, мы чакаем ад грамадскай арганізацыі новых ініцыятыў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Дарэчы, а як фінансуюцца Саюзы музеяў і самі ўстановы, скажам, у суседзяў? Ці значна адрозніваюцца схемы?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

—Па-рознаму. Буйныя і знакамітыя ўстановы атрымліваюць і асноўнае фінансаванне, і сродкі на рэалізацыю асобных праектаў. Вялікія сумы выкарыстоўваюцца для страхавых выплат пад час знакавых выставак. Вельмі развітое і дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Гэта тое пытанне, над вырашэннем якога мы цяпер няспынна працуем і ў нашай краіне.

Андрэй з Прагі (Чэхія):

— Якім чынам зацікаўліваеце спонсараў, як увогуле культура Беларусі наладжвае стасункі з прыватным бізнесам?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Дзякуй вам за ўвагу, бо заўжды прыемна чуць вось такія неабыякавыя тэлефанаванні, тым больш — з-за мяжы… Вы ведаеце, магу памыляцца, але важным складнікам тут выступае аўтарытэт кіраўніка ўстановы культуры і яго ўменне выбудоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Мы не толькі просім падтрымкі, але ўзамен прапаноўваем і свае паслугі. Першым рэальным крокам у наладжванні кантактаў з прыватным бізнесам і патэнцыйнымі інвестарамі стала, на мой погляд, стварэнне апякунскіх саветаў. У кожнай установе культуры яны арганізуюцца, і, пацікавіўшыся іх складам, мы ўбачылі вельмі шмат ініцыятыўных і самаадданых асоб. Адзначу дзейнасць Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, які сабраў у савет вельмі цікавых і ўплывовых людзей.

Канстанцін АНТАНОВІЧ:

— Якія цікавыя праекты рыхтуе Міністэрства да юбілеяў Якуба Коласа і Янкі Купалы ў наступным годзе?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Ёсць адзін новы, на мой погляд, цікавы праект. Мы плануем запісаць дыск "Мінск чытае Коласа і Купалу". Нашы знакамітасці, дзеячы культуры, мастацтва, навукі, спартсмены агучаць самыя розныя творы песняроў. Па-мойму, гэта будзе арыгінальна!

Яўген РАГІН:

— А як з ініцыятыўнасцю ў раённых музеях?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Натуральна, тут сітуацыя больш складаная. У вялікага музея — большыя магчымасці, таму што ён захоўвае буйныя калекцыі, якія можна паказаць усяму свету. У раённых установах — сабраны практычна толькі пасляваенны фонд, не шмат рарытэтаў. Але я лічу, што тут ёсць на сённяшні дзень такое выйсце: неабходна ствараць сумесныя праекты як на абласным, так і на рэспубліканскім узроўнях. Прыклад таму: некалькі гадоў назад арганізавалі ў Нацыянальным гістарычным музеі выстаўку слуцкіх паясоў літаральна з усёй рэспублікі… Таму цяпер, калі мы зацвярджаем планы працы на наступны год, абавязкова звяртаем увагу на пашырэнне партнёрскіх праектаў, на стасункі, у тым ліку, і з прыватнікам.

Яўген РАГІН:

— І зноў тут гаворка, на жаль, пра ініцыятыву зверху, а не знізу…

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Думаю, недастаткова працуюць рэгіянальныя метадычныя цэнтры. Магчыма, кіраўнікі аддзелаў культуры не заўжды робяць стаўку на ініцыятыўных і сапраўды творчых спецыялістаў. Назіральнікам ці маўклівым выканаўцам тут быць проста недаравальна.

Васіль ЗАРУБА, начальнік аддзела культуры Столінскага райвыканкама:

— Добрай раніцы. У мяне пытанне наконт Дзяржаўнай праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся. Праблема ў тым, што ў праграму на пачатку 2011 года ўнесены змяненні, фінансаванне работ на многіх аб'ектах спынена. Ці мяркуюцца тут нейкія пазітыўныя змены?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Я абавязкова высветлю сутнасць пытання ў эканамічным упраўленні Міністэрства культуры і праінфармую вас праз нашу газету або асабіста..

Васіль ЗАРУБА:

— Дзякуй вялікі… І другое пытанне. Як вы ведаеце, у вёсцы Гарадная раз на два гады ладзіцца міжнародны пленэр ганчароў, які для раёна даўно стаў знакавым. Збіраем сюды майстроў з сямі-васьмі краін. У наступным годзе пленэр будзе ўжо трэцім па ліку… Дык ці можна ўнесці гэтае мерапрыемства (для далейшага пашырэння яго геаграфіі і падтрымкі палескай глыбінкі) у план мерапрыемстваў Міністэрства культуры?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Вельмі ўдзячная вам, што такі пленэр на Століншчыне праводзіцца… Адкажу, што ў цяперашні час мы адпрацоўваем план работы на наступны год, так што вашу прапанову абавязкова абмяркуем.

Васіль ЗАРУБА:

— Дзякуй за адказы!

Кацярына з Мінска:

— Якія сродкі выдаткаваны Дзяржпраграмай "Культура Беларусі" на развіццё музейнай справы? Калі, нарэшце, паўнавартасна запрацуе Дзяржкаталог музейных прадметаў?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— На развіццё музейнай справы было запланавана 212,5 мільярда рублёў з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў. Што да стварэння Дзяржкаталога Музейнага фонду, дык магу сказаць, што мы — адзіная краіна на абсягах СНД, дзе ён створаны не толькі на паперы, але і віртуальна. На сённяшні дзень ён утрымлівае каля 20 тысяч запісаў. Хацела б адзначыць, што гэтаму папярэднічала вялікая праца: неабходна было ў межах рэспублікі вырашыць пытанні і набыцця праграмнага забеспячэння, і тэхнікі, і ўніфікаваных даведнікаў… Дарэчы, на стварэнне Каталога, згодна з Дзяржпраграмай "Культура Беларусі", было запланавана 2 мільярды рублёў.

Яўген РАГІН:

— Якія яшчэ перспектыўныя ды неадкладныя пытанні і праблемы разглядае і вырашае ваша ўпраўленне?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Упраўленне ўстаноў культуры і народнай творчасці курыруе таксама працу бібліятэчных, клубных устаноў, развіццё аматарскай дзейнасці і шэраг іншых пытанняў. Адна з першасных задач — нарматыўна-прававое забеспячэнне бібліятэчнай справы. Неабходна дапрацаваць каля дзесяці нарматыўных актаў. Стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі павінна паставіць нас у адзіны шэраг з іншымі краінамі ў гэтай сферы… Што да клубнай справы, дык тут таксама шмат нявыкарыстаных рэзерваў. Мы павінны разумець, што менавіта на мясцовым узроўні нараджаюцца зоркі. Таму самым сучасным патрабаванням павінны адпавядаць як установы культуры, так і іх супрацоўнікі. Яшчэ адзін важны складнік: творца самарэалізуецца падчас канцэртных праграм не толькі ў вёсцы, аграгарадку, райцэнтры і сталіцы, але і ў замежжы. І творцу неабходна выхоўваць менавіта на нацыянальным рэпертуары.

Яўген РАГІН:

— Пад час камандзіровак мы часта сутыкаемся вось з якой праблемай. Работнікі культуры ў раёнах не надта ведаюць, а што ж жадаюць ад іх наведвальнікі СДК. Маніторынгі ёсць, але яны не сістэмныя, не планавыя, а выпадкова-стыхійныя.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Пра гэта і гаворка. Адсутнасць сістэмы замінае бачыць перспектыву. Без адпаведнага аналізу як узроставай катэгорыі жыхароў той ці іншай мясцовасці, так і кола іхніх інтарэсаў рушыць наперад — немагчыма.

Жанчына, якая не прадставілася:

— Святлана Мікалаеўна, скажыце, калі ласка, ці ўдзельнічаюць дзіцячыя калектывы ў міжнародных конкурсах і ці ёсць ад гэтага вынік?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Канечне ж, удзельнічаюць! І ёсць пераможцы: народны ансамбль "Халідэй" Баранавіцкага ГДК стаў лаўрэатам конкурсу ў Польшчы, узорны ансамбль "Непаседы" Раснянскага СДК Камянецкага раёна — дыпламантам І ступені конкурсу ў Чэхіі, заслужаны аматарскі ансамбль танца "Радасць" пад час гастрольнага тура ў Англію і Чэхію стаў лаўрэатам Між-

Адказы на пытанні з электроннай пошты

Аляксандр з Мінска:

— Паважаная Святлана Мікалаеўна, ведаем, што вы праходзілі стажыроўку ў Вене. Як яна адбывалася? І ці ёсць надзея, што падобныя стажыроўкі стануць даступнымі для работнікаў культуры з абласцей і раёнаў?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Калі ёсць магчымасці для замежных стажыровак, мы заўжды імкнемся, каб у камандзе з кіраўнікамі былі і тыя, хто рэалізоўвае новыя творчыя праекты… У Вене мы былі разам з дырэктарам Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж" Сяргеем Клімавым і дырэктарам Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Алегам Рыжковым. Праграма атрымалася вельмі разнапланавай, разлічанай на ўсебаковы аналіз як унутранага, так і знешняга турызму. Мы пабачылі палацы, якія наведваюць турысты з усіх краін свету. Наведалі і аб'екты, прызначаныя для прэзентацыі сусветнай культуры менавіта жыхарам Аўстрыі. Гэта комплексныя цэнтры, складнікі холдынгаў, якія працуюць на прэзентацыю культуры менавіта для жыхароў Аўстрыі. Да прыкладу, сёлета ў замку Шалабург у Ніжняй Аўстрыі была адкрыта выстаўка "Венецыя" са збораў музеяў усяго свету. Бюджэт — 700 тысяч еўра. Мерапрыемства — самаакупнае…Па выніках камандзіроўкі дамовіліся пра наступны этап стажыроўкі ўжо для "вузкіх" спецыялістаў па асобных кірунках музейнай дзейнасці. Плануецца выезд сямі чалавек у 2012-м…

Канстанцін АНТАНОВІЧ:

— Дзе яшчэ стажыраваліся нашы работнікі культуры?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Да прыкладу, музейныя супрацоўнікі пастаянна вучацца ў Расіі, Літве. Станоўчая практыка ў гэтым кірунку — у Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, чые супрацоўнікі для стварэння новай экспазіцыі не аднойчы наведвалі калег у Славакіі, Польшчы, Германіі… Але, апрача стажыровак, ёсць яшчэ і трэнінгі. Апошні ладзіўся ў Кіеве… Натуральна, праблема з замежнымі стажыроўкамі існуе ў работнікаў раённых музеяў. Таму мы прапанавалі праводзіць практычныя семінары на базе Інстытута культуры Беларусі, дзе будзе прадстаўлены і замежны вопыт.

Яўген РАГІН:

— А чаго чакаеце ад Інстытута культуры Беларусі?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Ён, лічу, павінен стаць не толькі адукацыйна-аналітычным цэнтрам, але і генератарам ды акумулятарам творчых ініцыятыў, якіх так не хапае сёння рэгіёнам.

Адказы на пытанні з электроннай пошты

Работнікі культуры з Брэста:

— Як вы ставіцеся да стварэння новых клубаў па інтарэсах? Маем на ўвазе ваенна-гістарычныя, байкерскія аб'яднанні, гурткі аматараў усходніх танцаў і гэтак далей.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Пытанне гэтае — як арганічны працяг нашай гаворкі. Работнікам культуры проста неабходна рушыць у нагу з часам… Я не так даўно была ў Славакіі. Там пры Музеі народнага паўстання існуе ваенна-гістарычны клуб. Гэткую ж ідэю падхапіў у свой час і Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. А ў Маскве нам паказвалі ўзаемадзеянне паміж Таварыствам прыхільнікаў даўніны з музейнымі ўстановамі. Вынік такіх творчых стасункаў — рэканструкцыя баляў XIX стагоддзя. Пасля стажыроўкі я прапанавала дырэктару Нацыянальнага гістарычнага музея наладзіць і ў нас рэканструкцыі шляхецкіх касцюмаваных платных баляў, якія заўжды запатрабаваныя ў насельніцтва… Адкрыю тайну. Мы неўзабаве хочам правесці… Шакаладны баль сумесна з кандытарскай фабрыкай. Плануем арганізаваць выстаўку з фондаў музеяў. Магчыма, з удзелам Музея шакаладу ў Маскве. Чаму баль? Мяркую, не ўсім вядома, што многія кампазітары ў свой час стварылі не адзін твор у гонар шакаладу ці манпансье.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Плюс — вельмі неблагая рэкламная нагода і для спонсарскіх уліванняў.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Да такога свята і набор падарункавых цукерак не пашкодзіла б зрабіць. Словам, ёсць над чым падумаць не толькі культработнікам, але і "Спартаку" з "Камунаркай", прыватным кандытарам. Уявіце абгорткі з маляўнічымі выявамі Міра, Нясвіжа, Навагрудка! Мяркуем, баль такі арганізуем у адным з нашых замкаў.

Таццяна САЛАЎЁВА:

— Адкажыце, калі ласка, ці дастаткова арыгінальных прадметаў у экспазіцыі Нясвіжскага палацава-паркавага ансамбля?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Арыгінальных прадметаў не так і шмат. Усе ведаюць пра калекцыю партрэтаў Радзівілаў, але напаўненне замка аўтэнтычнымі экспанатамі будзе доўжыцца. Маю на ўвазе набыццё рэчаў, што яскрава характарызуюць радзівілаўскую эпоху. Вялізную дапамогу тут аказвае навуковы кіраўнік — кандыдат мастацтвазнаўства Вольга Бажэнава, якая мае трывалыя стасункі з тымі ж польскімі калегамі.

або ЦІ "КЛЮНЕ" ІНВЕСТАР НА ЎСТАНОВЫ-"БЛІЗНЯТЫ"?

народнага фальклорнага фестывалю. Шмат іншых перамог маем у Расіі, Італіі, Балгарыі, Літве, Латвіі…

Вольга з Барысава:

— Добры дзень. Наколькі актыўна выкарыстоўваецца беларускі рэпертуар у праграмах дзіцячых і дарослых самадзейных калектываў?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Я пра гэта казала ўжо сёння. Выкарыстоўваецца і будзе выкарыстоўвацца! Гэта добра бачна пад час прыняцця канцэртных праграм, у тым ліку пры наданні калектывам званняў "народны" ці "ўзорны". А ў вас ёсць перакананне, што рэпертуар самадзейных артыстаў недастаткова нацыянальны па сваім змесце?

Вольга:

— Не. Проста цікава.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Дзякуй вам за такую цікаўнасць. Мы над гэтым пастаянна працуем.

Вольга:

— Дзякую за адказ!

Святлана ВОЛКАВА, начальнік аддзела культуры Расонскага райвыканкама:

— Ці можна зменшыць колькасць дакументаў, якія неабходна рыхтаваць для надання самадзейнаму калектыву званняў "народны" ці "ўзорны"? Раней гэтая працэдура была больш простай.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Дзякуй за пытанне. Але званні прысвойваюцца ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, зацверджанымі пастановай Міністэрства культуры. Пералік дакументаў, неабходных для прысваення згаданых статусаў, канечне, не малы. Ды толькі ж і ўзровень у калектыву павінен быць адпаведным. У Аўстрыі, да прыкладу, існуе гэткая ж практыка. Значыць, падыход да справы — самы сур'ёзны. Так што поспехаў вам!

Святлана ВОЛКАВА:

— Дзякуй!

Канстанцін АНТАНОВІЧ:

— Скажыце, ці ёсць практыка супрацоўніцтва дзяржаўных устаноў з фрылансерамі — "людзьмі з вуліцы", што прапаноўваюць для рэалізацыі цікавыя творчыя праекты?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Ёсць. Да прыкладу, грамадзянін Украіны, наведаўшы Аўцюкі, прапанаваў нам стварыць у Калінкавічах музей гумару. Вельмі цікавая ідэя, якую мы падтрымалі і дапамаглі ў распрацоўцы навуковай канцэпцыі.

Галіна НЯЧАЕВА, дырэктар Веткаўскага музея народнай творчасці імя Ф.Р.Шклярава:

— Святлана Мікалаеўна, вельмі хацелася б пачуць ваша меркаванне наконт аднаго з накірункаў нашай дзейнасці. Мы амаль штогод рабілі надзвычай цікавыя экспедыцыі па пошуку і набыцці нашых знакамітых ручнікоў. На гэта выкарыстоўваем любую здабытую музеем капейчыну… Дык вось, ці не дапамагло б Міністэрства культуры наладзіць нам чарговую этнаграфічную экспедыцыю ў наступным годзе?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Аналагічнае пытанне сёння ўжо задавалі пад час "гарачай лініі"… Якраз цяпер ідзе планаванне на наступны год. Дасылайце прапанову!

Галіна Нячаева:

— Цудоўна! Зробім гэта сёння ж… І яшчэ пытанне. Многія помнікі патрабуюць цяпер рэстаўрацыі, і не толькі ў нашым музеі. Ці плануецца нейкая цэнтралізацыя для падрыхтоўкі рэстаўратараў з прысваеннем ім кваліфікацыі, так бы мовіць, на дзяржаўным узроўні?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Вы ведаеце, што мы даўно спрабуем вырашыць гэтае важнае для ўсіх пытанне. Калі прымалася Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі", мы закладалі ў яе пэўныя сродкі для стварэння рэстаўрацыйнага цэнтра. Было прынята рашэнне, што працаваць ён будзе менавіта пры Нацыянальным мастацкім музеі. Адпаведна запланавана і выдаткаванне дадатковых штатных адзінак, каб рэстаўратары змаглі працаваць на ўсю рэспубліку.

Галіна НЯЧАЕВА:

— І гэта вельмі важная для нас справа. Не сакрэт, што любы прадмет пасля правядзення ягонай рэстаўрацыі патрабуе пастаяннага і дбайнага догляду. Таму пытанне з вучобай рэстаўратараў — самае надзённае. Так што, калі ласка, усяляк "прабівайце" яго вырашэнне.

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Рэстаўратары будуць працаваць не толькі ў Нацыянальным мастацкім музеі (у тым ліку маю на ўвазе і навучанне). Рэстаўрацыйныя майстэрні застаюцца і ў Нацыянальным гістарычным музеі (па метале, тканінах, дрэве, паперы, кераміцы), у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (па зброі). Мы пабудавалі работу такім чынам, каб у дадзеным плане максімальна ахапіць усе нашы музеі, бо разумеем: у раённых цэнтрах справа з рэстаўрацыяй ды і з кансервацыяй музейных прадметаў застаецца праблематычнай… Для навучання рэстаўратараў робім і спецыяльныя наборы ў навучальныя ўстановы сферы. Практыка названых спецыялістаў ладзіцца на базе Нацыянальнага мастацкага музея.

Галіна НЯЧАЕВА:

— І яшчэ адно, Святлана Мікалаеўна, надзвычай актуальнае пытанне, звязанае з захаваннем гісторыка-культурных помнікаў. На кожным з іх цяпер — ахоўныя знакі. Гэта добра — для добрых людзей. А для "чорных" капальнікаў — дакладны ўказальнік: тут, маўляў, і трэба капаць ды нішчыць. Асаблівую актуальнасць праблема набывае для нашага маланаселенага паўднёвага ўсходу Гомельшчыны. Дык ці абароніць заканадаўства нашы помнікі ад такіх "археолагаў"?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Пытанне больш да ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі, якое ўзначальвае Ігар Чарняўскі. Будзем сумесна над ім працаваць. Праблема, безумоўна, ёсць.

Галіна НЯЧАЕВА:

— Дзякуй за адказы на пытанні!

Канстанцін АНТАНОВІЧ:

— Колькі мяркуецца адкрыць новых музеяў бліжэйшым часам?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Цягам пяці гадоў — 13 музеяў. Паўтаруся, наша меркаванне ў тым, каб гэтыя ўстановы мелі не толькі краязнаўчы кірунак (хоць і гэта надзвычай важна!), але і непаўторнасць тут павінна прысутнічаць. Вельмі хацелася б, да прыкладу, адкрыць Дзіцячы музей у сталіцы (у Полацку такі ўжо існуе), а таксама археалагічны, політэхнічны... У апошнія на еўрапейскіх абшарах ідуць сем'ямі і на цэлы дзень. Не так даўно падобны політэхнічны музей наведала ў Мюнхене. Уражанне незабыўнае! Усё рухаецца, здзіўляе, паўсюль — самыя сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, з аднаго нерэальнага свету ты імгненна трапляеш у іншы, але не менш цікавы і пазнавальны. Ёсць тут і ўтульныя месцы, каб выпіць кавы… Карацей, нам такіх устаноў не стае.

Канстанцін АНТАНОВІЧ:

— Ці супрацоўнічае Міністэрства культуры з ведамаснымі музеямі?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Апошнім часам — вельмі актыўна! Сёння гэта 200 ведамасных устаноў і 1479 — сістэмы адукацыі. Мы робім адну справу. Да ўсяго, у гэтых музеях, як правіла, працуюць колішнія работнікі нашай сферы. Сярод іх — нямала сталых музейных экспертаў. Да прыкладу, кіраўнік музея Нацыянальнага банка. А яшчэ — музеі сувязі, чыгункі…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Нядаўна быў у Беразіне. Там дзяржаўнага музея няма, а ёсць прыватны — драўлянай лыжкі. Ці мяркуецца аказваць дапамогу ўстановам падобнага кшталту? У іх, напэўна ж, праблемы і з дызайнам экспазіцыі, і з устаноўкай сігналізацыі…

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Паколькі гэта прыватны музей, згодна з заканадаўствам, фінансавае пытанне ўстаноўкі сігналізацыі не можа быць вырашана Міністэрствам культуры. Іншая справа — сумесныя творчыя праекты. Тут ініцыятыва будзе, безумоўна, падтрымана... А працэс стварэння прыватных музеяў мяркуем усебакова падтрымліваць.

Матэрыялы "гарачай лініі" падрыхтаваў Яўген РАГІН
Фота Юрыя ІВАНОВА

Адказы на пытанні з электроннай пошты

Музейшчыкі з Барысава:

— Якой мэты збіраецца дасягнуць Міністэрства культуры пад час правядзення фестывалю "Інтэрмузей-2012"?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Мы сёння ўжо казалі пра неадкладнасць павышанай увагі да рэгіёнаў. Таму міністрам культуры Паўлам Латушкам было прапанавана правесці гэты прэстыжны форум менавіта ў адным з рэгіёнаў. Губернатар Гродзенскай вобласці Сямён Шапіра падтрымаў гэтую прапанову, і мы ўпэўнены, што мерапрыемства пройдзе на высокім узроўні і стане адной з галоўных культурных падзей 2012 года. Што да канцэпцыі, дык на "Інтэрмузеі" збіраемся паказаць праз розныя праекты ўсе музеі краіны. Будзе шмат гасцей: папярэдняя дамоўленасць ёсць ужо з Чэхіяй, Аўстрыяй, Германіяй, Польшчай, Літвой, Расіяй, Украінай. Цягам наступнага года беларускія музейшчыкі будуць браць удзел у конкурсах на лепшыя даследаванне, экспазіцыю, яе дызайнерскае вырашэнне, міжнародны праект і музейна-адукацыйную праграму, на лепшы рэгіянальны музей і, натуральна, лепшы музей краіны. Перамога ў конкурсе будзе гарантаваць пэўнае фінансаванне заяўленых ініцыятыў. Спадзяёмся, што ў гэтым нас падтрымае і прыватны бізнес… Мы хацелі б паказаць і ўзаемадзеянне Міністэрства культуры з міністэрствамі адукацыі, спорту і турызму… Наогул жа, фестываль будзе прымеркаваны да Дня работнікаў культуры.

Адказы на пытанні з электроннай пошты

ГОЛУБЕВА А.А.:

— Ці плануецца перагляд дакументаў, што рэгулююць групы па аплаце працы для кіраўнікоў устаноў культуры?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Міністэрства культуры штогод накіроўвае ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва ды ў Міністэрства фінансаў краіны праекты нарматыўных актаў (апошні — у лістападзе 2011-га), у якія ўнесены прапановы аб пераглядзе названых у пытанні груп. Вядома, што аплата рэгламентуецца дакументам больш чым дзесяцігадовай даўніны. Натуральна, сённяшняя сітуацыя патрабуе "абсучаснення". Прапановы наступныя: зменшыць паказчыкі, прынятыя яшчэ за савецкім часам. Напрыклад, каб атрымаць першую групу па аплаце працы музейнага кіраўніка, трэба мець не менш за 400 тысяч наведвальнікаў у год. Сёння на гэты паказчык не выходзіць нават Брэсцкая крэпасць, адзін з самых наведваемых і знакавых аб'ектаў краіны. Але і тут штогод бывае крыху больш за 300 тысяч турыстаў. Тое ж самае і з колькасцю музейных прадметаў. Не яна павінна ўплываць на групу аплаты, а статус экспаната, яго рарытэтнасць. А ў фондзе, да прыкладу, можа знаходзіцца падшыўка звычайных газет, дзе кожны экзэмпляр — адзінка. Дык што важней: адна адзінка слуцкага пояса ці 365 газет? Дыферэнцаванага падыходу патрабуе і сённяшняя аплата працы бібліятэкараў, работнікаў клубных устаноў, дамоў рамёстваў… Будзем спадзявацца, што нашы прапановы разгледзяць станоўча.

Надзея з Лепеля:

— Паважаная Святлана Мікалаеўна! Адкажыце, калі ласка, ці дастатковая колькасць фондавых калекцый маецца на сёння ва ўстановах культуры Беларусі?

Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— Напэўна, гаворка вядзецца пра музейныя прадметы? Бо фондавых калекцый можа быць і пяць, і трыццаць… А музейных прадметаў у нас на сёння каля чатырох мільёнаў. Справа іншая, колькі з іх — сапраўдныя рарытэты… Раскрыю яшчэ адну тайну. У планах падрыхтоўка выдання "Скарбы Беларусі". Гаворка — пра нацыянальныя шэдэўры, што знаходзяцца ў нашых зборах. Праект ажыццяўляецца сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Готыка кафлі,

або Што ў імбрычку першадрукара?

У 2012-м на старонках "К", несумненна, неаднаразова будзе ўзнімацца тэма старажытнага Полацка, звязаная з 1150-гадовым юбілеем з часу яго першай летапіснай згадкі. І пакуль рыхтуюцца разнастайныя ўрачыстасці, мясцовыя археолагі падагульняюць атрыманыя пад час апошніх раскопак звесткі. З гэтай нагоды наш карэспандэнт наведаў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, выкладчыкі і студэнты якога сёлета актыўна "капалі" пласты мінуўшчыны горада.

Яшчэ адзін крок да разгадкі чарговай таямніцы полацкай мінуўшчыны

Як адзначыў доктар гістарычных навук, загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі ПДУ Дзяніс Дук, у археалагічным плане даследчыкі падышлі да юбілею Полацка з даволі добрымі вынікамі, падагульняючы шматгадовыя раскопкі, што пачаліся ў 1928 годзе. У прыватнасці, археолагі даказалі: Полацк сапраўды існаваў у IX ст. і тая дата, якую шырокая грамадскасць будзе адзначаць, мае непасрэднае дачыненне да горада. Акрамя таго, сёння можна дакладна казаць пра тэрыторыю і асяроддзе гэтага месца, прафесійныя заняткі жыхароў.

Ці не адным з найважнейшых дасягненняў полацкіх археолагаў апошніх гадоў стала лакалізацыя месца, дзе вучыўся славуты Францыск Скарына. Да гэтага часу вучоныя і аматары кніжнай культуры ведалі, што першадрукар нарадзіўся і пэўны час жыў у Полацку, пасля чаго паехаў па свеце ўдасканальваць свае веды і займацца выдавецкай дзейнасцю. Аднак, вядома ж, без выдатнай пачатковай адукацыі пакарэнне Еўропы наўрад ці магло адбыцца. Шляхам аналізу разнапланавых звестак і артэфактаў айчынныя гісторыкі высветлілі: у юнацтве Скарына вучыўся ў мясцовых бернардзінцаў. Да гэтай думкі прывяло, да прыкладу, і тое, што Скарына з маладых гадоў цудоўна валодаў латынню, што выкладалі ў тагачасным Полацку толькі ў кляштары, які бернардзінцы заснавалі напрыканцы XV ст.

Але дзе ж размяшчалася першая alma mater асветніка? Дакладнага адказу да апошняга часу ні ў каго не мелася. Па словах Дзяніса Дука, раней існавалі толькі версіі, што гэтая навучальная ўстанова размяшчалася ў старажытнай частцы Полацка. Канкрэтнае ж месцазнаходжанне выявіць доўгі час не атрымлівалася. І толькі нядаўна архітэктар і рэстаўратар Вадзім Гліннік у касцёле святых Францыска і Бернардзіна выпадкова прыкмеціў фрэску з выявай полацкага бернардзінскага кляштара. Дзякуючы гэтаму з'явіліся звесткі, аб ягоным знешнім выглядзе ды прыкладным размяшчэнні. Кляштар, мяркуецца, меў шмат карпусоў, рамесныя майстэрні, а таксама — так званыя вытворчыя карпусы, касцёл, і, вядома ж, памяшканні, дзе ўласна і праводзілася навучанне. Сёлета адзін з жылых будынкаў раскапаны групай археолагаў на чале з Дзянісам Дукам.

Як адзначыў гісторык, знойдзены дом быў пабудаваны з дрэва. На жаль, не знойдзена ніякіх каменных падмуркаў, якія можна было б музеефікаваць. У той жа час, археолагі выявілі фрагменты абпаленай падлогі, склепы, і, што самае каштоўнае, рэшткі ўнікальнай па сваіх гістарычных вартасцях печы. Як аказалася, пры яе стварэнні ўжывалася архаічная сценавая кафля, якая раней вырабляласа толькі на нямецкіх землях. Такім чынам, палачане былі першымі, хто пазнаёміўся з кафляй, што і сёння скарыстоўваецца пры абліцоўцы печаў. Па словах Дзяніса Дука, на той час гэта было сапраўднае ноу-хау. Пацвярджаюць жа датаванне аб'екта і манеты першай паловы XVI ст. Акрамя таго, сярод адметных выяўленых артэфактаў вялікую каштоўнасць мае цікавы па форме керамічны імбрычак. Мо ім карыстаўся і сам Францыск Скарына?

Калі ж вярнуцца да кафлі, дык мяркуецца, што яна вырабляласа на тэрыторыі Полацкай зямлі, паколькі з тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы хоць і прывозілі розны сталовы посуд (фрагменты яго таксама неаднойчы знаходзілі ў горадзе), але — не будматэрыялы. А вытворчасць, кажучы сучаснымі словамі, арганізавалі, хутчэй за ўсё, па ліцэнзіі.

Факты сведчаць: нямецкі майстар прыехаў у Полацк і пачаў вырабляць кафлю на мясцовай гліне. Але не вядома: прывёз ён форму з сабой альбо зрабіў яе ўжо ў горадзе над Палатой? Тым не менш, на кафлі змешчаны рэлігійны сюжэт, не ўласцівы мясцовай традыцыі. Да таго ж, па стылі перадачы выявы апошні меў відавочныя гатычныя элементы.

Як паведаміў Дзяніс Дук, адносна нядаўна полацкія археолагі даследавалі і тэрыторыю ў межах колішняга ніжняга замка — самую старажытную частку горада. Там у свой час размяшчалася селішча — месца, дзе сялілася асноўная частка людзей, якія, у выніку, і стварылі Полацк. І калі раней не ўдавалася адкрыць гістарычны слой, што папярэднічаў "гарадской" гісторыі Полацка, то ў выніку апошніх раскопак на гарадзішчы вызначана прастора матэрыяльнай культуры балтаў (у тым ліку — з характэрнай керамікай), якія да прыходу славян засялялі гэтую тэрыторыю. Апошні факт дазваляе казаць: горадам Полацк стаў толькі з прыходам славян. Пры гэтым вялікую спадчыну пакінулі і старажытныя балты, у тым ліку — назву ракі Палаты.

У выніку плённых археалагічных раскопак, якія папярэднічаюць юбілею Полацка, было прыадкрыта шмат загадак і таямніц старажытнага горада. Цяпер Полацк чакае практычнае ўвасабленне гістарычных даследаванняў: яны мусяць узбагаціць і без таго разнастайную турыстычную інфраструктуру горада. А таму "К" абавязкова вернецца на сваіх старонках да тэмы.

К.А.

На здымках: фрагменты кафлі і імбрычку XVI ст; месца раскопак-2011 у Полацку.
Фота Дзяніса ДУКА

Біблія ў бронзе

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адкрыў памятны знак у гонар 430-годдзя выхаду ў свет Астрожскай Бібліі.

Знак устаноўлены ў вёсцы Тарасава, што ў некалькіх кіламетрах ад беларускай сталіцы. Помнік размешчаны непадалёк ад будынка Цэнтра праваслаўнай культуры імя Святога дабравернага князя Канстанціна Астрожскага, што ўзводзіцца на тэрыторыі мясцовага праваслаўнага прыхода.

Доктар філалагічных навук, прафесар Іван Чарота падкрэсліў, што асвячэнне і адкрыццё памятнага знака, які стварыў скульптар, член Беларускага саюза мастакоў Міхаіл Інькоў, закладвае і пачатак асветніцкаму Цэнтру ў колішнім маёнтку дабравернага князя Астрожскага.

Намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Уладзімір Ламека, які прысутнічаў на адкрыцці і асвячэнні памятнага знака, адзначыў, што яму, як і ўсім праваслаўным славянам, асоба Канстанціна Астрожскага вельмі дарагая і блізкая. На яго прыкладзе, на думку Уладзіміра Ламекі, варта выхоўваць і маладое пакаленне.

Згодны з гэтай думкай і настаяцель храма Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Тарасава, протаіерэй Сергій Кузьмянкоў. Па словах святара, ідэя стварэння Цэнтра праваслаўнай культуры з'явілася некалькі гадоў таму падчас святкавання 400-годдзя памяці дабравернага князя Канстанціна Астрожскага. Тады ўдзельнікі і госці ўрачыстасцей адзначалі, што цягам апошняга стагоддзя гэтая вялікая гістарычная постаць была беспадстаўна забытая.

Акрамя таго, дзякуючы падтрымцы з боку царквы і дзяржавы, з гэтага года ў межах праваслаўнага прыхода вёскі Тарасава праводзяцца "Астрожскія чытанні", якія збіраюць вядучых даследчыкаў айчыннай гісторыі.

К.А.

На здымку: памятны знак.
Фота аўтара

Праз Слова — спазнаць свет

Вярнуцца відушчымі...

Культурнае супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана за апошні месяц набыло яшчэ большую трываласць. Гомель прыняў выстаўку сучасных мастакоў-графікаў Мусеіба Амірава і Эльнура Бабаева "NEO BRATIMOE" у рамках Дзён культуры Азербайджана ў Культурнай сталіцы Беларусі і СНД-2011, Баку сустрэла і беларусаў на I Міжнароднага біенале лялек "Fusion Doll". А ў Нацыянальнай бібліятэцы беларускай сталіцы адбылася прэзентацыя кнігі, прысвечанай сусветна вядомаму азербайджанскаму вучонаму-афтальмолагу XX стагоддзя, акадэміку Зарыфе Аліевай. Чым не нагода згадаць пра паняцці "культура здароўя", "культура здабытку інтэлекту і рук чалавека"?

Гісторыі жыцця выдатных людзей Азербайджана цяпер даступныя для айчыннай аўдыторыі. У галоўнай кніжнай скарбніцы нашай краіны чытач зможа пазнаёміцца з беларускай версіяй выдання, якое ў Мінску, акрамя шматлікіх гасцей, прэзентаваў і сам аўтар кнігі — вядомы пісьменнік, дэпутат Парламента Азербайджана Гусейнбала Міраламаў.

Кніга "Зарыфа Аліева" — зборнік успамінаў і жывых сведчанняў. Больш за сотню чалавек сталі аўтарамі сапраўды маляўнічага партрэта гэтай яркай, велікадушнай і таленавітай асобы. Самы ж моцны бок кнігі, падаецца, у тым, што кожная яе старонка напоўнена любоўю. Сапраўднай, добрай, шчодрай, той, якую адчувала і дарыла людзям сама Зарыфа Ханум Аліева.

Пераклад кнігі ініцыявала Пасольства Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь і, у прыватнасці, Пасол Ісфандзіяр Бахтыяр аглы Вагаб-задэ: дыпламат асабіста кантраляваў працэс выпуску кнігі. Па яго словах, у найбліжэйшых планах Пасольства — выпуск шэрагу выданняў на беларускай мове, што паспрыяе яшчэ большаму зблiжэнню беларускай і азербайджанскай культур.

Дык хто ж яна, гераіня кнігі?

...Дванаццацігадовай Назіле, дачцэ простых сялян з невялікага сяла, пасля цяжкай хваробы лекары вынеслі страшны прысуд — поўная страта зроку. Гэтая вестка адняла сілы маці дзяўчынкі, якая пасля шматлікіх паходаў да дактароў страціла надзею на выздараўленне дачкі, пакуль… лёс выпадкова не звёў яе з доктарам Аліевай. А праз шэсць месяцаў дзяўчынка вярнулася дадому відушчай... Зрэшты, падобных гісторый жыццё геніяльнай у сваёй прафесіі Зарыфы Ханум Аліевай налічвае сотні. Будучы адданай дачкой, жонкай і добрай маці, яна ўвесь свой вольны час прысвячала навуцы. У 1960-я доктар Аліева адна з першых у СССР пачынае распрацоўваць новы кірунак — прафесійныя хваробы вачэй работнікаў хімічнай прамысловасці. Не пакідаючы практыку і педагагічную дзейнасць, яна займаецца даследаваннямі на прадпрыемствах...

Аліева апісала дзясяткі прафесійных захворванняў тых, хто працуе ў хімічнай індустрыі, распрацавала методыку іх дыягностыкі, лячэння і — прафілактыкі. Абарона яе доктарскай, якая адбылася ў адным з найаўтарытэтных афтальмалагічных цэнтраў — НДІ хвароб вачэй імя Г.Гельмгольца, — мела рэзананс у навуковым свеце.

Зарыфа Ханум Аліева ў якасці самаадданага лекара затраціла нямала сіл на лячэнне шэрагу захворванняў органа зроку, у тым ліку — на ліквідацыю трахомы ў Азербайджане. Доктар правяла навуковыя даследаванні з мэтай вывучэння розных этапаў захворвання і пошуку метадаў лячэння. Не пакідаючы даследаванняў у галіне прафесійных паталогій, Зарыфа Ханум захапілася новым для тагачаснай медыцыны кірункам — ірыдадыягностыкай. Яна адна з аўтараў унікальнай працы "Асновы ірыдадыягностыкі", якая стала настольнай кнігай для многіх практыкуючых лекараў.

Наогул, пад паўтары сотні навуковых прац, 12 манаграфій, дзясятак методык на вынаходніцкім узроўні аўтарства Аліевай знайшлі прызнанне навукоўцаў. У 1981-м за цыкл яе даследаванняў Акадэміяй меднавук СССР ёй была прысуджана найвышэйшая ўзнагарода ў галіне афтальмалогіі — прэмія імя прафесара М.Авербаха.

Пра жыццёвы шлях выдатнай жанчыны вядома многае. Яна была глыбока інтэлігентным чалавекам: выдатна грала на фартэпіяна, славілася як знаўца нацыянальнай і сусветнай класікі, заўзяты тэатрал, знаўца жывапісу. Яна, мяккая і спагадлівая, імкнулася не толькі перадаць веды дзецям, але і далучыць іх да сваіх маральных ідэалаў. Акадэміка Аліеву заўсёды акружала мноства вучняў. З іх ліку яна расціла і выдатных спецыялістаў, і людзей самых шырокіх дэмакратычных поглядаў на ўсе пытанні жыцця: гэта бліскучыя прафесіянały-афтальмолагі, вядомыя далёка за межамі Азербайджана, — дактары навук Націк Тагі-задэ, Чынгіз Джурула-задэ, Паша Гялбінур, Акіф Садыхаў, Рафік Тахмазаў ды многія іншыя, хто з гонарам называе сябе вучнямі Зарыфы Аліевай.

Акадэмік Зарыфа Ханум Аліева, якая праславіла азербайджанскую афтальмалогію на ўвесь свет, памерла на 62-м годзе жыцця — 15 красавіка 1985 года.

Яўген РАЗАНОВІЧ, студэнт Інстытута журналістыкі БДУ

Міхал Кулеша: у супрацьвагу многім "рамеснікам"...

Эцюд вандроўніка на Белым возеры

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 48 — 49)

Аналагічную па зладжанай, выразнай і акуратнай прасторавай кампазіцыі карціну Міхал Кулеша прысвяціў яшчэ адной ваеннай асобе — гетману. Гэты вершнік на чале атрада выезджае ў паход. Ён — на белым кані, з працягнутай гетманскай булавой у правай руцэ. Магчыма, сюжэт карціны быў навеяны прабываннем мастака на Украіне, дзе ён цікавіўся тэмай нацыянальна-вызваленчай барацьбы ўкраінцаў. Спачатку я меркаваў, што Кулеша ўвасобіў вобраз Багдана Хмяльніцкага, бо яго адлюстраванне ў чымсьці нагадвала адзіны прыжыццёвы гравіраваны паясны партрэт нацыянальнага героя Украіны з булавой, створаны галандцам Вілем Хондыусам — прыдворным мастаком караля Уладзіслава IV Вазы, дарэчы, аўтарам гравіраванай карты Палесся. Аднак калі я вывучыў захаваныя партрэты-гравюры гетманаў Вялікага Княства Літоўскага і каронных гетманаў Каралеўства Польскага, мяркуючы па некаторых гістарычных і побытавых дэталях-атрыбутах, прыйшоў да думкі: магчыма, Кулеша адлюстраваў тут Кшыштафа Радзівіла "Перуна" альбо Станіслава Яна Яблоноўскага. А можа Кулеша проста выявіў нейкі абагульнены вобраз тыповага ўяўлення пра гетмана таго часу?

М.Кулеша. "Стары і Новы замкі ў Гродне".

Вядома, гетманства было распаўсюджана ў ВКЛ з канца XV ст. (да канца XVIII ст.), пачынаючы з першага беларускага гетмана Канстанціна Астрожскага. Аднак поўнае юрыдычнае афармленне гэтай пасады як дзяржаўнай звязана з іменем вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта I Старога (1467 — 1548). Ён як непасрэдны кіраўнік дзяржавы і войска прызначаў замест сябе гетмана, надзеленага наступнымі паўнамоцтвамі: мог караць падначаленых за парушэнне дысцыпліны, гвалт над насельніцтвам, карупцыю... Пазней пасада "Вялікага гетмана Літоўскага" з'яўлялася сталай пасадай у Княстве ў якасці найвышэйшага вайсковага кіраўніка, які разам са сваім намеснікам — палявым гетманам — камандаваў у час бою ўзброенымі сіламі. Апошніх двух гетманаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай звалі Сімон Касакоўскі і Юзаф Забела.

А зараз хачу коратка расказаць пра Аляксандра Арлоўскага, які таксама маляваў не толькі гетманаў, але і данскіх казакоў, сярэднявечных рыцараў, мушкецёраў, разбойнікаў, піратаў... Аднак мой інтарэс зараз трошкі іншы. Ён датычыцца адносін Арлоўскага да нашай зямлі. Пра гэта, канешне, не мог не ведаць і Міхал Кулеша, лічачы яго сваім суайчыннікам і блізкім па натуры чалавекам. Да ўсяго, Арлоўскі, у свой час, змагаўся за свабоду пад сцягамі Тадэвуша Касцюшкі. Хто ведае, мо малады Кулеша быў асабіста знаёмы з Арлоўскім дзесьці ў 1820-я? Віленскі край і Пецярбург, зрэшты, не так далёка адзін ад аднаго, і ў тыя часы культурныя ўзаемаадносіны жыхароў гэтых мясцін былі вельмі ажыўленымі. Яшчэ скажу, што менавіта Аляксандр Арлоўскі восенню 1824 года прытуліў Адама Міцкевіча, сябра Кулешы, на сваёй кватэры ў самы першы ссыльны прыезд апальнага паэта ў Пецярбург. Пазней Міцкевіч пісаў пра Арлоўскага: "Живал он при дворе, однако в райской жизни / Всё позабыть не мог о брошенной отчизне…" Так, Міцкевіч меў на ўвазе радзіму мастака — Польшчу. А пасля разгрому паўстання 1831 года Аляксандр Восіпавіч быў настолькі падаўлены маральна, што жыццё яго пайшло пад адхон, і ён раптоўна памёр у Пецярбургу ад сардэчнай хваробы.

А нарадзіўся будучы мастак у Варшаве. Яго бацька Восіп Арлоўскі меў у горадзе Седліца добрую карчму, што ў пэўным сэнсе паўплывала на "вясёлы" характар юнага Аляксандра. Амаль 10 гадоў ён наведваў майстэрні баталіста Ж.-П. Нарблена дэ ла Гурдэна і гравёра Б.Фаліно, дзе паспеў у рысаванні вельмі добра і прафесійна "набіць руку". Але ў перапынках паміж вучобай служыў добраахвотнікам у арміі Касцюшкі і не раз удзельнічаў у баях. Авантурыст па натуры (у добрым сэнсе слова), часам вёў разгульнае жыццё: ці то прападаў дзень і ноч у корчмах, ці то падарожнічаў з вандроўнымі фокуснікамі па краіне. Аднак яго талент як мастака, аўтара натурнага партрэта Касцюшкі (у капелюшы), кампазіцый "Бітва пад Рацлавічамі", "Паход войска Касцюшкі", "Атрад кракаўскіх партызан", заўважылі князь Юзаф Панятоўскі і княжна Ірына Чартарыйская. Яны і зрабілі ўсё, каб баламутны, але таленавіты Арлоўскі ў 1802 годзе патрапіў у Пецярбург. Аднак цэлы год да таго 24-гадовы мастак жыў у Беларусі, вывучаючы побыт, норавы і звычаі беларускай шляхты, гістарычныя рэаліі толькі што зніклых ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

А далей усё пайшло як па масле: у Пецярбургу яго ўзяў пад сваё апекаванне вялікі князь Канстанцін Паўлавіч, брат імператара, і даў яму майстэрню ў Мармуровым палацы сталіцы, дзе мастак зрабіў свае лепшыя творы ў жывапісе, рысунку, акварэлі і стаў, па сутнасці, першым літографам Расіі. Ягоны вопыт Кулеша ды калегі так ці інакш "усмоктвалі" потым у Віленскім універсітэце. Дарэчы, свае малюнкі Арлоўскі асабіста літаграфаваў.

Можна смела сказаць: па папулярнасці ў расійскім грамадстве Аляксандр Арлоўскі як мастак у 1810 — 1820-я знаходзіўся ў першай пяцёрцы найлепшых жывапісцаў і графікаў. Не выпадкова, што ўжо ў 1809 г. за карціну "Бівуак казакоў" ён стаў акадэмікам! Быў, канешне, чалавекам "з гонарам", ведаў сабе цану, ганарыўся сваім дарам віртуознай імправізацыі і "звышгукавой" хуткасцю алоўка і пэндзля. Нездарма Пушкін казаў пра яго — "хуткі аловак".

Але менавіта гэта часам і перашкаджала яму. Часта мастак дапускаў хібы ў прарысоўцы дэталей, хай і другарадных, пабочных. "Гультаяваты, прыгультаяваты", — так атэставаў яго той самы Канстанцін Паўлавіч, незадаволены нядбайнасцю творцы. Так, Арлоўскі мог намаляваць вусы пяхотнаму афіцэру, а між тым нашэнне вусоў было дазволена толькі афіцэрам лёгкай кавалерыі — гусарам і ўланам. Альбо страявой зброяй воіна ВКЛ была пяхотная шпага, а Арлоўскі даваў яму шаблю кавалерыйскага ўзору. Лейб-гвардыі Літоўскі полк, напрыклад, быў палком пяхотным, а мастак мог "надзець" на яго салдат вопратку кавалергардаў. Канешне, гэта дробязі, але Кулеша, малюючы з арыгінала Арлоўскага гусараў, усё ж выправіў "памылку" старэйшага калегі датычна размяшчэння шаблі (гл. "К" № 49 за 2011 г.).

Мне здаецца, лепшую характарыстыку Арлоўскаму даў гісторык рускага мастацтва барон Мікалай Урангель: "Першы паэт вайны і міру, паэт гераічнага эпасу. Кур'ёзны арыгінал, пра якога гаворяць усе, але чыё жыццё мала вядома. Легендарная асоба, герой неверагодных прыгод, забаўны дзівак, дзікі самадур і вытанчаны калекцыянер рэдкасцей. Першы мастак побыту, насмешнік-карыкатурыст, партрэтыст, жывапісец жывёл, пейзажыст... Паляк, вучань француза, які правёў паўжыцця ў Расіі. Мастак, салдат, вандроўны акцёр, улюбёнец вялікага князя Канстанціна. Атлет, падмануты муж… Аўтар тысяч малюнкаў. Дзіўная мешаніна здольнасцей і недахопаў, характэрная фігура трывожнага і спакойнага жыцця Аляксандраўскага часу. Яго малюнкі — цэлы дзённік эпохі рамантычнай і чароўнай".

А.Арлоўскі. Аўтапартрэт.

Хачу распавесці таксама пра яшчэ адну ўнікальную асобу, якая мела прамое дачыненне да майго героя Міхала Кулешы, ды і да ўсёй Беларусі ў цэлым. Вышэй я ў некалькіх словах узгадваў Юзафа Ігнацыя Крашэўскага ў сувязі з ягоным лістом да К.Камарніцкага пра Кулешу. У Польшчы, канешне, ён "бацька гістарычнага рамана", "тытан працы", "энцыклапедыст", словам, класік літаратуры... Але ў Беларусі Крашэўскага ведаюць, у асноўным, па папулярным рамане "Графіня Козель". Між тым, для Беларусі, для даследавання яе гісторыі і народнага побыту, ён зрабіў вельмі многа, не кажучы пра яго сяброўскія адносіны з такімі сучаснікамі, як А.Міцкевіч, Я.Чачот, Р.Зянькевіч, А.Машынскі, Ш.Канарскі, А.Шэмеш, Я.Дамель, У.Сыракомля, К.Тышкевіч. Між тым, Міхалу Кулешу Крашэўскі не толькі дапамог надрукаваць яго літаграфічны альбом з выявамі помнікаў старажытнай Беларусі, але часам падтрымліваў яго.

Невядома, калі яны ўпершыню сустрэліся: Крашэўскі таксама вучыўся жывапісу і маляванню ў Я.Рустэма ў Віленскім універсітэце, толькі пазней за Кулешу. Аднак, як і Кулеша, у 1830 годзе быў выключаны з другога курса за рэвалюцыйную дзейнасць і пасаджаны на год у віленскую турму. Тут ён выканаў 25 малюнкаў пяром — ілюстрацыі да дзвюх частак "Дзядоў" Міцкевіча — і напісаў баладу "Манастыр на гары" (пад уплывам Міцкевіча). Пасля вызвалення вандраваў па Палессі ды Валыні. Мяркую, дзесьці ў 1830-я гады Кулеша і Крашэўскі пазнаёміліся. А мо яшчэ ў Вільні?

Ю.І. Крашэўскі.

Крашэўскі дзяцінства правёў у вёсцы Доўгае каля Пружан. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, а ў 1829-м стаў студэнтам Віленскага ўніверсітэта. Тады яму было 17 гадоў… Праз некаторы час ён ужо рэдагаваў віленскі часопіс "Athenaeum", дзе друкаваліся А.Шэмеш, Я.Дамель, А.Кіркор ды іншыя прадстаўнікі беларускай культурнай "эліты". Самае дзіўнае тое, што Крашэўскі за сваё жыццё (1812 — 1887) надрукаваў каля 600 (!) тамоў прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі, прац па гісторыі, філасофіі, этнаграфіі, археалогіі. Па колькасці твораў ён мог бы заняць, мабыць, першае месца ў Кнізе рэкордаў Гінеса! Я не буду пералічваць яго галоўныя працы, але нагадаю толькі некаторыя з тых, якія закранаюць Беларусь: вершаваная трылогія "Анафеляс" (рэцэнзаваў Я.Чачот), раманы "На Палессі", "Апошняя са слуцкіх князёў", "Кароль у Нясвіжы. 1784", аповесць "Касцёл св. Міхаіла ў Вільні", камедыі, навуковыя працы і дарожныя нарысы: "Старажытная Літва", "Пінск і Піншчына", "Палескі кірмаш", "Корчмы і дарогі на Палессі", "Адзенне сялян і мяшчан з ваколіц Брэста, Кобрына і Пружан", "Успаміны пра Палессе, Валынь і Літву"... Заўважу, што ўсе гэтыя рэчы былі выдадзены яшчэ пры жыцці Кулешы. Цікавая і мастацкая спадчына Крашэўскага. Серыя тыпаў беларускіх сялян, архітэктурныя будынкі, рамантычныя краявіды Беларусі, ілюстрацыі да сваіх твораў і твораў У.Сыракомлі і К.Тышкевіча... Сам ён гравіраваў кніжныя вокладкі.

Таксама невядома, калі ў апошні раз бачыліся Кулеша і Крашэўскі. Мо гэта здарылася ў Беластоку, незадоўга да смерці Кулешы, калі Крашэўскі назаўсёды па загадзе ўлад пакідаў радзіму: гэта ў самы разгар паўстання 1863 года. У эміграцыі шмат займаўся творчасцю і выдавецкай дзейнасцю, не цураўся і авантурных палітычных амбіцый. Сядзеў нават паўтара года ў магдэбургскай турме за шпіянаж на карысць Францыі супраць Прусіі. Памёр у Жэневе, але пахаваны ў Кракаве. Летам 2012-га споўніцца 200 гадоў з дня яго нараджэння. Хацелася б, каб і ў нас не забыліся на гэтага чалавека. Ведаю, што тры гады таму пры музеі "Пружанскі палацык" была сабрана ініцыятыўная група па падрыхтоўцы мерапрыемстваў да 200-годдзя Ю.Крашэўскага, мэта якой — стварэнне Дома-музея пісьменніка на месцы колішняй сядзібы сям'і Крашэўскіх у в. Доўгае, дзе ён правёў дзяцінства. Гэта сядзіба рабавалася і да, і пасля Другой сусветнай вайны, і на яе месцы практычна нічога не засталося. Што там робіцца сёння — не ведаю…

…Апошнія гады Міхал Кулеша пражыў у Беластоку Гродзенскай губерні, дзе нейкі час выкладаў рысаванне ў Інстытуце высакародных дзяўчат. Тады ў павеце пражывала каля 20 тысяч жыхароў, з іх — амаль 70% беларусаў. У Беластоку 6 лістапада 1863 года і скончылася жыццё творцы і педагога.

Сказаць праўду, Міхал Кулеша пасля смерці не быў зусім забыты, як гэта здаралася з некаторымі асобамі яго пакалення. Цягам наступных 50 гадоў, да Першай сусветнай вайны, яго пейзажныя работы ўпрыгожвалі многія дамы ў Мінску, Гродне, Беластоку, Вільні, Варшаве. Так, у часопісе 1911 г. "Tygodnik Wilenski" №11 мінскі мастак Б.Адамовіч узгадваў: "У нашым доме побач з творамі вядомых мастакоў Дамеля і Ваньковіча былі вельмі цікавыя гуашы Кулешы, якія ў дзіцячым узросце выклікалі вельмі прыемнае ўражанне".

Напрыканцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя мастак Міхаіл Пятровіч Станюта распавядаў мне, што ў іх сям'і, у мястэчку Ігумен (сёння — Чэрвень), дзе ён нарадзіўся, яшчэ да першай рэвалюцыі 1905 г. вісела на сцяне адна цікавая літаграфія Кулешы з відам руін Луцкага замка. Тады пра Кулешу я наогул нічога не ведаў, і гэтае імя толькі выпадкова адбілася ў памяці — і, мабыць, з-за дзіўнага прозвішча. А вось больш падрабязна распытаць Станюту пра гэтага мастака я не здагадаўся…

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 10 снежня — да 17 снежня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

Экспазіцыі:

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:

■ **"Мастацтва суверэннай Беларусі. Новыя паступленні ў музейныя калекцыі. 1991 — 2011".**
■ **"Зачараванне графікай".**
■ **"Вобраз Прасвятой Багародзіцы ў беларускім іканапісе XVII — XVIII стст.".**
■ Персанальная выстаўка **Генадзя Мурамцава**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Цярноўнік крэсаў".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка японскага мастацтва.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
■ Выстаўка рускага жанравага жывапісу XIX — пачатку XX стст.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:

■ **Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Старажытная Беларусь".**
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**
■ **"Водбліскі ваеннай славы"** (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**

Выстаўкі:

■ Выстаўка дакументаў з асабістага архіва Усевалада Ігнатоўскага.
■ З 13 — рэспубліканская выстаўка **"Вайна 1812 года ў гісторыі Мінска"**.
■ Фотавыстаўка **"Сцежкі творчасці. Фрагменты"** Я.Казюлі, прысвечаная шматгадовай творчасці фатографа.
■ **"Заплакалі струны жывыя"** (выстаўка музычных інструментаў).

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка Р.Махмудава **"Лятаючыя кветкі".**
■ Выстаўка С.Нурматова **"Даспехі часоў Паўночнай вайны".**
■ Выстаўка фатаграфій **Сяргея Плыткевіча "Вандроўка па Беларусі".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

■ Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
■ Выстаўка **"Дарога да Пушкіна"** (з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна "Міхайлаўскае").
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
■ Да 12 — выстаўка выкладчыкаў кафедры касцюма і тэкстылю БДАМ (В.Бартлавай, А.Обадавай, В.Багачовай) **"З песень жыцця...".**
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
■ Інтэрактыўная гульня **"У пошуках Папараць-кветкі".**

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:

■ **"З вамі вярнуўся дахаты я..."** (да 120-годдзя з дня нараджэння М.Багдановіча).
■ Літаратурна-мастацкая выстаўка **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**
■ **"Тэатральныя лялькі — госці музея"** (сумесна з Беларускім дзяржаўным тэатрам лялек).
■ **"Планета творцаў і іх герояў"** (жывапіс, графіка).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

■ **"Дзень добры, свет!"** (фотаработы Марыі Валчэцкай у рамках праекта "Няхай дзяцінства будзе шчаслівым!".
■ **"Партызанскі лагер".**
■ **"Русь-Гімалаі".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея.

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:

■ **"Час азірнуцца".**
■ **"Класікі беларускага жывапісу XX ст.".**

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:

■ **Пакой крывых люстэркаў.**
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі".**

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстаўка **"Я не самотны..."**, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння М.Багдановіча.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ Выстаўка **А.Аракчэевай "Краіна цудаў".**
■ Фотавыстаўка **В.Бубіч "Горад унутры".**

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ



г. Гомель, вул. Карповіча, 4, пр. Леніна, 43. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:

■ **"Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка".**
■ Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:

■ **"Прастора душы".**
■ **"Сучасны польскі жывапіс. Жывапіс педагогаў Акадэміі мастацтваў г. Катавіцэ".**
■ Выстаўка работ народнага мастака Беларусі **Леаніда Шчамялёва.**

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

НА I-е ПАЎГОДДЗЕ 2012 ГОДА!

Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **10 — "Шахеразада"** М.Рымскага-Корсакава.
"Тамар" М.Балакірава.
■ **11 — "Кармэн"** Ж.Бізэ.
■ **13 — "Сіла лёсу"** (канцэрт).
■ **15 — "Травіята"** Дж.Вердзі.
■ **16 — "Аіда"** Дж.Вердзі.
■ **13 — "Сублімацыя кахання"** (пікантная камедыя) А.дэ Бенедэці.
■ **15 — "Сталіца Эраўнд"** (парадаксальная камедыя) С.Гіргеля.
■ **16 — "Дарагая Алена Сяргееўна"** (псіхалагічная драма) Л.Разумоўскай.
■ **17 — "Планета"** (бясконцая гісторыя) Я.Грышкаўца.
■ **13 — "Бабін бунт"** (музычная камедыя) Я.Пцічкіна.
■ **14 — "Марыца"** (аперэта) І.Кальмана.
■ **15 — "12 крэслаў"** (эксцэнтрычны балет) Г.Гладкова.
■ **16 — "Блакітная камея"** (мюзікл) К.Брэйтбурга.
■ **17 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне Next"** (мюзікл для дзяцей і дарослых) А.Рыбнікава.
"Казкі венскага лесу" (гала-канцэрт).

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **11 — "Бураціна.BY"** (мюзікл) А.Рыбнікава.
"Шклянка вады" (мюзікл) У.Кандрусевіча.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **11 — "Бука"** М.Супонін.

Навагодняя праграма

■ **17 — "Навагоднія мары Слоніка".**
Ёлачная праграма "Слонік і Дзед Мароз".

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўны рэдактар — Людміла Аляксееўна КРУШЫНСКАЯ
Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.
Рэдакцыя: Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).
Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.
Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Пётр ОВАД, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290-22-50 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 290-22-50. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2011.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7819
Падпісана ў свет 9.12.2011 у 15.30
Замова 5829
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.
ISSN 1994-4780